*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**14** мая 2008 г. серада № 87 (26200)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У ДРУГІМ ПАЎГОДДЗІ!

Ідзе падпіска на ІІ паўгоддзе і ІІІ квартал 2008 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 9200 | 27600 | 55200 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8700 | 26100 | 52200 |
| 63858 (ведамасны) | 14700 | 44100 | 88200 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 13400 | 40200 | 80400 |

## Беларусь і Расія — ядро АДКБ

**Беларусь належна выконвае абавязкі па сваёй зоне адказнасці як у Саюзнай дзяржаве, так і ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ). Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 13 мая на сустрэчы з генеральным сакратаром АДКБ Мікалаем Бардзюжам, які знаходзіцца ў Мінску з рабочым візітам.**

«Фактычна Беларусь і Расія — ядро Арганізацыі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму мы павінны сумесна вырашаць усе праблемы, што ўзнікаюць у зоне АДКБ».

Генеральны сакратар АДКБ падкрэсліў, што Беларусь праяўляе сябе як адзін з самых актыўных членаў Арганізацыі. «Пазіцыя кіраўніцтва Беларусі заўсёды была канструктыўная і арыентаваная на эфектыўнае забеспячэнне як уласнай, так і калектыўнай бяспекі», — сказаў Мікалай Бардзюжа. Прэзідэнт Беларусі і генеральны сакратар АДКБ абмеркавалі ўвесь спектр актуальных пытанняў Арганізацыі на фоне падрыхтоўкі да сесіі Савета калектыўнай бяспекі (СКБ) на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, а таксама сітуацыю, якая складваецца ў зоне дзеяння Дагавора. «У шэрагу рэгіёнаў свету, у прыватнасці ў Цэнтральнай Азіі, абстаноўка сапраўды дастаткова вострая», — адзначыў генеральны сакратар.

Кіраўнік АДКБ далажыў Прэзідэнту Беларусі аб канкрэтных мерапрыемствах па барацьбе з незаконнай міграцыяй, адпрацоўцы механізмаў прадухілення надзвычайных сітуацый тэхнагеннага і прыроднага характару, а таксама аб удасканаленні метадаў барацьбы з наркатрафікам, асабліва з Афганістана. У размове з журналістамі генеральны сакратар АДКБ адзначыў, што Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы і Еўразійскае эканамічнае супольніцтва (ЕўрАзЭС) выбудоўваюць паміж сабой самыя цесныя і трывалыя адносіны.

«Мы разглядаем ЕўрАзЭС у якасці бліжэйшай для нас міжнароднай структуры», — сказаў генеральны сакратар. Кіраўнікі структурных падраздзяленняў АДКБ і ЕўрАзЭС штомесяц сустракаюцца, адпрацоўваюць дакументы аб узаемадзеянні. У прыватнасці, генеральны сакратар адзначыў падрыхтоўку Пратакола аб узаемадзеянні ЕўрАзЭС і АДКБ, у якім вызначаны сумесныя праекты дзвюх арганізацый. Паводле слоў Мікалая Бардзюжы, бяспеку ЕўрАзЭС павінна забяспечваць АДКБ. У сваю чаргу Еўразійскае эканамічнае супольніцтва павінна дапамагаць Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ў эканамічным складальніку. «У прынцыпе, мы сёння гэта і робім, асабліва ў пытаннях кантролю за міграцыяй і ў ваенна-эканамічнай сферы», — дадаў ён.

## Беларусь не прымае палітыку прымянення сілы і санкцый

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 13 мая даў інтэрв'ю аднаму з буйнейшых міжнародных агенцтваў навін — ІА «Рэйтэр».**

Кіраўнік беларускай дзяржавы крыху больш за год таму ўжо размаўляў з журналістамі названага агенцтва. У сувязі з гэтым у цэнтры ўвагі цяперашняй сустрэчы былі пытанні, што датычацца змяненняў ва ўнутраным і знешнім жыцці рэспублікі, узмацнення яе прывабнасці для замежных інвестараў, перспектыў развіцця ў бліжэйшыя гады. Прэзідэнт падзяліўся сваім бачаннем далейшых інтэграцыйных працэсаў з Расійскай Федэрацыяй, узаемаадносінаў дзвюх краін у сувязі са змяненнямі ў расійскім кіраўніцтве.

Былі закрануты пытанні і аб маючых адбыцца парламенцкіх выбарах у Беларусі, удзеле ў іх апазіцыйных палітыкаў, а таксама аб магчымых намерах Аляксандра Лукашэнкі зноў балаціравацца на пасаду Прэзідэнта. Гаворачы аб шляхах далейшага паляпшэння адносінаў Беларусі з ЕС, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Гэта пытанне да Еўрапейскага саюза, а не да мяне. Мы гатовы з вамі прайсці па любым шляху для таго, каб палепшыць нашы адносіны. Умова адна — вы павінны бачыць у нас партнёраў, вы павінны бачыць у нас суверэнную і незалежную дзяржаву. І з гэтых пазіцый мы гатовы з вамі будаваць адносіны, грунтуючыся на любым напрамку». Што датычыцца ўзаемаадносінаў з ЗША, то кіраўнік дзяржавы заявіў: «Беларусь абсалютна не фарсіруе ніякіх працэсаў, у тым ліку пагаршэння адносінаў з амерыканцамі. Калі амерыканцы думаюць з намі будаваць адносіны з пазіцыі сілы і санкцый, то нам такія дыпламаты і адносіны не патрэбны. Калі амерыканцы хочуць бачыць у нас незалежную, суверэнную дзяржаву і на гэтых прынцыпах будаваць адносіны, мы і душу, і краіну для іх адкрываем. Але амерыканцы павінны разумець, што мы — незалежная суверэнная дзяржава. І мы не дазволім, каб тут арудавалі амерыканцы так, як яны хочуць». «Палохаць нас санкцыямі не трэба, мы выжывем. У нас няма ў такім аб'ёме амерыканскага капіталу, адток якога адсюль можа разбурыць нашу эканоміку. У нас наогул эканоміка не завязана на адну дзяржаву», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

### ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ВЫКАЗАЎ СПАЧУВАННІ СТАРШЫНІ КНР У СУВЯЗІ З РАЗБУРАЛЬНЫМ ЗЕМЛЕТРАСЕННЕМ

Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з разбуральным землетрасеннем у правінцыі Сычуань, якое прывяло да шматлікіх чалавечых ахвяраў, ад імя беларускага народа і ад сябе асабіста выказаў глыбокія спачуванні старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Ху Цзіньтао, а таксама родным і блізкім загінулых.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вёска Какорыца Драгічынскага раёна.

### ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

15 мая 2008 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу дзесятая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

## Пераможам жаночы рак

На любыя вашы пытанні гатова адказаць **загадчыца аддзела анкагінекалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук Ірына Аляксандраўна КАСЭНКА.** На пытанні, звязаныя з прафілактыкай і лячэннем дабраякасных і злаякасных пухлін малочнай залозы адкажа **загадчык аддзела анкамамалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук, прафесар Леанід Аляксеевіч ПУТЫРСКІ.**

***Сваe пытанні, паважаныя чытачкі, вы можаце пакінуць у рэдакцыі газеты па нумары 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) да 17 мая. Адказы спецыялістаў будуць надрукаваны ў «Звяздзе» пасля памянёнай даты.***

Ва Ўрадзе

## Метал стане «празрыстым»...

### Да 1 ліпеня плануецца арганізаваць работу электроннай гандлёвай пляцоўкі для рэалізацыі металапрадукцыі асноўным пастаўшчыкам

**Зацверджаная амаль тры гады таму Ўрадам Праграма цэнтралізаваных закупак металапрадукцыі і яе рэалізацыі для патрэб народнай гаспадаркі Беларусі павінна была навесці парадак на аптовым рынку металу за кошт скарачэння колькасці неабгрунтаваных пастаўшчыкоў, доля якіх, між іншым, у аб'ёме імпартуемай металапрадукцыі дасягала 50 працэнтаў. Акрамя таго, дакументам прадугледжвалася знізіць цану на метал не менш як на 10—12 працэнтаў за кошт таго, што набывацца прадукцыя будзе непасрэдна ў яе вытворцаў і больш буйнымі партыямі. Як гэтыя задачы выконваюцца? — аб гэтым і ішла ўчора гаворка на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага.**

Паводле меркавання міністра гандлю Аляксандра Іванкова, у цэлым пастаўленыя Праграмай мэты выконваюцца. Так, за перыяд рэалізацыі Праграмы значна палепшылася структура імпарту металапрадукцыі. Паводле даных міністра, па выніках леташняга года з набытых 2,3 мільёна тон металапрадукцыі 69 працэнтаў было закуплена непасрэдна ў вытворцаў буйнымі партыямі. Пры гэтым аб'ём паставак пасрэднікамі скараціўся больш як у 10 разоў. А самае галоўнае, што пры агульным павышэнні цэнаў на металапрадукцыю на сусветным рынку і ў краінах Садружнасці цэны на беларускім рынку раслі больш марудна: напрыклад, калі ў 2004 годзе на айчынным рынку цэны на розныя віды металапрадукцыі перавышалі расійскія на 11—30 працэнтаў, то ў першым квартале гэтага года яны супастаўныя з расійскімі, а па арматуры значна ніжэйшыя. Як і прадугледжвалася Праграмай, устаноўленая схема закупак металапрадукцыі распаўсюджаная практычна на ўсе віды чорных металаў і вырабаў з іх. Як адзначыў Аляксандр Іванкоў, сёння асноўныя пастаўшчыкі за кошт кансалідацыі заявак цэнтралізавана закупляюць 88 працэнтаў металапрадукцыі непасрэдна ў вытворцаў і рэалізуюць у Беларусі па канкурэнтных цэнах, якія ніжэйшыя за рынкавыя. У якасці прыкладу эканамічнай эфектыўнасці рэалізацыі прынятай Праграмы міністр прывёў работу ААТ «Белметал», якое закупляе металапрадукцыю па цэнах супастаўных з закупачнымі цэнамі МАЗа і МТЗ, а рэалізуе дробнымі партыямі па цэнах, ніжэйшых за рынкавыя, дзякуючы чаму айчынныя спажыўцы толькі летась зэканомілі больш за 14 мільярдаў рублёў.

Разам з тым у сферы абароту металапрадукцыі на тэрыторыі рэспублікі не ўдалося пазбегнуць і парушэнняў, на якіх міністр спыніўся асобна. У прыватнасці, выяўлены факты, калі нават асноўнымі пастаўшчыкамі закупляўся метал з парушэннем устаноўленага Праграмай парадку. Як паказала праверка, летась аб'ём такіх закупак склаў каля 9 тысяч тон, альбо 6,8 працэнта ад агульнага аб'ёму металу, што імпартуецца асноўнымі пастаўшчыкамі. Палова такіх закупак ажыццявіла дзяржаўнае прадпрыемства «Гандлёвы дом «Белрэсурсы», ранейшае кіраўніцтва якога наўмысна скажала інфармацыю. Дарэчы, дырэктар гэтага прадпрыемства за дапушчаныя парушэнні ў кастрычніку мінулага года быў вызвалены ад пасады, а матэрыялы па выяўленых фактах перададзены ў праваахоўныя органы. Усяго ж за дапушчаныя парушэнні ўстаноўленага парадку да адказнасці прыцягнуты 14 кіраўнікоў і адказных асобаў дзяржаўнага аб'яднання «Белрэсурсы» і яго арганізацый, у тым ліку ад займаемых пасад вызвалены два кіраўнікі.

Каб не дапусціць у далейшым «хібаў» з боку асноўных пастаўшчыкоў, паводле слоў Аляксандра Іванкова, прадпрымаецца шэраг дадатковых мераў па больш жорсткім кантролі за іх работай. У прыватнасці, з мая гэтага года асноўным пастаўшчыкам забароненыя закупкі металапрадукцыі ў пасрэдніцкіх арганізацый нават у мінімальнай колькасці. Акрамя таго, у бліжэйшы час закупка металу будзе ажыццяўляцца толькі праз трох асноўных пастаўшчыкоў, сярод якіх дзяржаўнае аб'яднанне «Белрэсурсы» і РУП «Гомельхімгандаль». Адначасова вядзецца работа па арганізацыі з 2009 года цэнтралізаваных закупак металапрадукцыі праз адну юрыдычную асобу — дзяржаўнае аб'яднанне «Белрэсурсы» з далейшай рэалізацыяй праз разгалінаваную сетку баз асноўных пастаўшчыкоў. Да таго ж да 1 ліпеня 2008 года Мінгандаль плануе арганізаваць работу электроннай гандлёвай пляцоўкі для рэалізацыі металапрадукцыі асноўным пастаўшчыкам. Гэта, зазначыў міністр, дазволіць забяспечыць празрыстасць гандлёвых здзелак.

Як лічыць Аляксандр Іванкоў, для таго, каб праграма рэалізавалася больш поўна, разам з забеспячэннем у поўным аб'ёме заявак ад усіх спажыўцоў неабходна прадастаўленне «Белрэсурсам» крэдыту з лімітам запазычанасці да 80 мільёнаў долараў ЗША. «Прадастаўленне такога крэдыту абгрунтаванае, — заўважыў міністр. — Выгадна купляць метал у вытворцаў па перадаплаце, чым з адтэрміноўкай плацяжу».

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СПЕКУЛЯНТЫ ПЕРАСТАЛІ ЎКЛАДВАЦЦА Ў ЕЎРА

**Спекулятыўна настроеныя інвестары ў ЗША ўпершыню са снежня 2005 года паставілі на тое, што долар будзе даражэць у адносінах да еўра, піша The Financial Times.**

Такім чынам трэйдары адрэагавалі на слых аб тым, што еўрапейская валюта ў красавіку дасягнула свайго максімуму і больш не будзе павышацца ў адносінах да долара. У мінулым месяцы еўра дасягнула рэкорднай ацэнкі ў 1,6 долара, але ўжо ў пачатку мая апусцілася ніжэй за 1,55 долара.

### ЦІМАШЭНКА ЗНОЎ ЗАКРЫЛА РОТ ЮШЧАНКУ

**На першым пасля велікодных вакацый пасяджэнні парламента ў аўторак, 13 мая, прэзідэнт Украіны Віктар Ючшанка павінен быў выступіць са штогадовым пасланнем Вярхоўнай Радзе.**

Аднак фракцыя Блока Юліі Цімашэнкі да пачатку пасяджэння заблакавала працу парламента. БЮЦ патрабуе занясення ў парадак дня трох антыінфляцыйных законаў, а таксама звальнення кіраўніка Фонду дзяржмаёмасці Валянціны Семянюк. Варта адзначыць, што Юшчанка спрабуе звярнуцца з пасланнем да дэпутатаў яшчэ з лютага. Але з-за нестабільнай сітуацыі ў парламенце зрабіць гэта яму ніяк не ўдаецца.

### НА ПОЎНАЧЫ ЛІВАНА — ВАЙНА

**У раёне Трыпалі працягваюцца ўзброеныя сутыкненні з выкарыстаннем агнястрэльнай зброі і мінамётаў паміж прыхільнікамі суніцкага ўрада і шыіцкімі апазіцыянерамі з «Хізбалах».**

Паводле папярэдніх паведамленняў, на працягу панядзелка там загінуў адзін чалавек, яшчэ чацвёра параненыя. Усяго, паводле інфармацыі ліванскіх спецслужбаў, за апошнія 6 дзён, з моманту пачатку супрацьстаяння, загінулі каля 60 чалавек, параненыя — каля 200. Гэта самая вялікая колькасць ахвяраў з часоў грамадзянскай вайны ў Ліване 1975—1990 гадоў. Шыіцкія баевікі захапілі ўсе мусульманскія раёны Бейрута і некалькі вёсак у гарах. Прэм'ер-міністр Лівана Фуад Сіньёра абвінавáціў шыіцкіх апазіцыянераў у спробе арганізацыі дзяржаўнага перавароту.



### ГІГАНЦКІЯ ПАНДЫ Ў КІТАІ НЕ ПАЦЯРПЕЛІ



**Прадстаўнікі кітайскага ляснога ўпраўлення заявілі, што 68 гіганцкіх пандаў, якія жывуць у даследчых цэнтрах у правінцыі Сычуань, знаходзяцца ў бяспецы.**

Даследчыя цэнтры размешчаныя ў гарадах Чэнду і Яань, якія знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці ад эпіцэнтра землетрасення магнітудай 7,8 бала, што адбылося ў панядзелак. Нагадаем, што ў эпіцэнтры было разбуранае каля 80 працэнтаў будынкаў, вялікая колькасць людзей дагэтуль знаходзіцца пад заваламі. Па стане на аўторак, лік загінулых ацэньваецца ў дзесяць тысяч чалавек. Учора ў горадзе Чэнду адбылося паўторнае землетрасенне. Магнітуда штуршкоў, па розных ацэнках, склала ад 5,9 да 6,1 балаў па шкале Рыхтэра.

### САМЫ ПРЫГОЖЫ МІНІСТР ІТАЛЬЯНСКАГА ЎРАДА ПАЗІРАВАЛА ТОПЛЕС



**Сёння Палата дэпутатаў італьянскага парламента зацвердзіць склад новага ўрада, у які ўвойдзе 21 міністр, прычым 13 з іх — навічкі. Чатыры міністэрскія партфелі дасталіся прадстаўніцам прыгожай паловы.**

Кіраўніком міністэрства па праблемах раўнапраўя прэм'ер Сільвія Берлусконі прызначыў 32-гадовую Мару Карфанья, былую мадэль і тэлевядучую, якая заняла ў 1997 годзе шостае месца ў конкурсе «Міс Італія» і ў свой час пазіравала як топлес, так і ў напаўаголеным выглядзе для календароў і мужчынскіх часопісаў ***(на фота)***. Нямецкі штодзённік Bild абвясціў яе «самым прыгожым міністрам у свеце».

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08087>

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.05.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 137,00 |
| 1 еўра | 3 316,30 |
| 1 латвійскі лат | 4 753,64 |
| 1 літоўскі літ | 960,38 |
| 1 чэшская крона | 133,12 |
| 1 польскі злоты | 979,65 |
| 1 расійскі рубель | 90,09 |
| 1 украінская грыўня | 445,56 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 23,7199 |
| 10 UAH | 47,8822 |
| 1000 BYR | 11,0892 |
| EUR | 36,8346 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 13.05.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

*Раіса БАРАВІКОВА:*

## «МЫ ЗАЎСЁДЫ БЫЛІ ЛІТАРАТУРНАЙ ШКОЛАЙ»

### Часопіс «Маладосць» адзначае сваё 55-годдзе

Для літаратурнага часопіса гады — гэта сапраўды багацце, таму што чым больш ён жыве, тым больш набыткаў трапляе ў скарбонку творчасці, тым больш адкрыццяў і асобаў прадстаўляе. І гэта сапраўды яго маладосць, таму што багата літаратурных скарбаў было створана да яго з'яўлення, а колькі яшчэ будзе... Гэтую пераемнасць пакаленняў у беларускай літаратуры імкнуцца захаваць такія выданні, як часопіс «Маладосць». Зразумелая і ўзнёсласць, з якою гаворыць пра часопіс яго **рэдактар Раіса БАРАВІКОВА:**

— Святочны нумар «Маладосці» выйшаў яшчэ ў красавіку. Наш № 4 за гэты год атрымаўся выключна юбілейны. У ім змешчана вельмі многа ўспамінаў людзей, якія прайшлі праз «Маладосць» і сталі вядомымі творцамі. Ёсць цікавае інтэрв'ю з Міколам Аўрамчыкам, адным з найстарэйшых нашых паэтаў, які працаваў у «Маладосці» з першага дня яе заснавання. У гэтым нумары вельмі багата ілюстрацый, фотаздымкаў. Фотаздымкі з архіва Валянціна Ждановіча, які працаваў у «Маладосці» шмат гадоў, прадставіла дачка майстра. Сярод іх ёсць вельмі рэдкія, напрыклад, апошні здымак Уладзіміра Караткевіча, які быў зроблены ў ліпені 1984 года... Але мы жывём не толькі ўспамінамі, мы працягваем адлюстроўваць сённяшняе літаратурнае жыццё. У святочным нумары чытачу прадстаўляем новы раман Леаніда Дайнекі «Назаві сына Канстанцінам». Гэты пісьменнік таксама шмат гадоў працаваў у «Маладосці» і нам прыемна, што былыя «маладосцеўцы» працягваюць радаваць сваімі творамі.

***— Як ацанілі гэтую працу чытачы? І ці знаходзяць водгук новыя праекты, якія, магчыма, не зусім традыцыйныя для часопіса?***

— Гэты нумар атрымаўся сапраўды святочным, незвычайным, вельмі цікавым. Гэта адзначылі многія нашы чытачы, прыхільнікі, сябры. Недарма мы атрымалі шмат званкоў, лістоў з падзякамі і віншаваннямі. Мы адчуваем цікавасць да многіх нашых задум і новых праектаў.

Напрыклад, разам з Баранавіцкім універсітэтам мы стварылі «Бібліятэку адной кнігі», дзе кожны беларускі пісьменнік прадстаўлены адной кнігай. Баранавіцкая бібліятэка выдзеліла памяшканне пад яе. Мне здаецца, гэты праект дазваляе паказаць багацце нашай літаратуры ў асобах.

Магчыма, незвычайны для нас, але цікавы праект «Зямля і людзі», дзе мы таксама знаёмім з Беларуссю, толькі ўжо паказваем, якія людзі працуюць дзеля багацця нашай краіны, якія ёсць у нас выдатныя гаспадары. Адна з такіх публікацый была прысвечана вытворчаму аб'яднанню «Астрамечава», якую ўзначальвае Анатоль Скакун, выдатны гаспадар, які цяпер яшчэ з'яўляецца сенатарам. Прадстаўлялі мы камбінат «Зара». У нас трывалыя сувязі з Брэстчынай. Напрыклад, два нумары мы цалкам прысвячалі літаратурнай Берасцейшчыне. Гэты рэгіён багаты на творчыя імёны, мы рады, што маем магчымасць знаёміць з імі.

***— Свята «Маладосці» было ў красавіку, але адзначаеце вы яго сёння. Напэўна, да падрыхтоўкі вечарыны ў гонар часопіса вы рыхтаваліся вельмі адказна...***

— Сёння ў нас узнёслы настрой найперш з-за таго, што «Маладосць» — вядомае выданне, якое цікавае людзям. Гэтую ўзнёсласць мы адчуваем ужо амаль месяц — насамрэч святочная дата ў нас была 17 красавіка. І менавіта ў наш дзень нараджэння мы атрымалі віншаванне ад Прэзідэнта Беларусі. Іншая справа, што саму ўрачыстасць прыйшлося перанесці з-за шматлікіх святаў, якія адзначаліся ў нашай краіне. Нам здаецца, што свята «Маладосці» павінна быць асаблівым. Гэтую асаблівую атмасферу «Маладосці» мы паспрабуем стварыць на ўрачыстай вечарыне, якая адбудзецца 14 мая. Так, мы да яе рыхтаваліся. Гэта будзе свята слова. Слова мы адчуем і праз музыку, таму што запрошаны многія маладыя барды і ўжо вядомы паэт і спявак Алесь Камоцкі. Нашы госці сумаваць не будуць. Запрошаны многія дзяржаўныя асобы, прадстаўнікі ўніверсітэтаў, з якімі мы сябруем, творчых саюзаў, у прыватнасці з Саюза пісьменнікаў Беларусі. Радуе тое, што наша свята падзяляе літаратурная моладзь — перадусім «Маладосць» існуе менавіта дзеля яе. Наша задача — выхоўваць маладых літаратараў у лепшых традыцыях пісьменства. Шмат пакаленняў беларускіх літаратараў прайшло праз наша выданне. Мы заўсёды былі своеасаблівай літаратурнай школай.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ПА СЕМ КВАТЭР НА БРАТА!

Згодна статыстычных звестак, на пачатак года па дзве кватэры мелі ва ўласнасці 53 тыс. 522 грамадзяніны Беларусі, па тры кватэры — 2 тыс. 74, па чатыры — 127, па пяць — 11, па шэсць — 2 , па сем кватэр — таксама 2 чалавекі.

**БЕЛТА.**

### ПАСАЖЫРЫ, ЗВЕРЦЕ РАСКЛАД

Як паведамілі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, у сувязі з адменай работ па рамонце моста цераз раку Бярэзіну на ўчастку Асіповічы — Жлобін, 19, 20 і 21 мая адпраўленне і прыбыццё пасажырскіх цягнікоў і беспераcадачных вагонаў будзе ажыццяўляцца згодна з дзеючым раскладам. У гэтай сувязі грамадзянам, якія набылі праязныя дакументы папярэдне да 29 красавіка на дату ад'езду 19, 20 і 21 мая, трэба ўдакладняць час адпраўлення і прыбыцця цягнікоў у даведачным бюро вакзала станцыі Мінск—Пасажырскі па тэлефонах: 1 05, 225 70 00, 225 54 10.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### «КАСТРЫЧНІЦКАЯ» ЗАКРЫВАЕЦЦА 1 ЧЭРВЕНЯ

Станцыя Мінскага метрапалітэна «Кастрычніцкая» закрываецца 1 чэрвеня гэтага года на рэканструкцыю перасадачнага вузла (на пяць месяцаў). Аб гэтым паведаміў начальнік КУП «Дырэкцыя па будаўніцтву Мінскага метрапалітэна» Васіль Жыбуль.

Закрыюць таксама і перасадку паміж «Купалаўскай» і «Кастрычніцкай». Працаваць будзе толькі станцыя «Купалаўская», — удакладніў субяседнік. Прадугледжваецца дадаткова выдзеліць аўтобусы, якія будуць курсіраваць ад станцыі метро «Плошча Леніна» да станцыі «Плошча Перамогі».

### ЗЛОДЗЕЯ ЎЗЯЛІ НА КАЗЫРКУ ЦАРКВЫ

Праваахоўнікамі папярэджана спроба крадзяжу каштоўнага абраза. У Полацку 27-гадовы жыхар пасёлка Баравуха-1, які месяц таму вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі, спрабаваў пранікнуць у Дрэўлеправаслаўную паморскую царкву Успення Прасвятой Багародзіцы і авалодаць абразам Прасвятой паморскай Божай Маці. Паводле даных старшага інспектара групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў Дэпартамента аховы МУС Аляксандра Герасімава, у царкве спрацавала сігналізацыя і на месца здарэння выбыла група затрымання Полацкага аддзела Дэпартамента аховы. Спатрэбілася ўсяго 2 хвіліны, каб апынуцца ля храма: невядомы якраз у гэты час з казырка будынка спрабаваў улезці ў царкву праз разбіты шклопакет. Прыблізны ацэначны кошт абраза — каля 100 тысяч долараў ЗША.

### КОШТ ЗЛОЎЖЫВАННЯ — 52 МЛН?..

Пракуратурай Мінскай вобласці па матэрыялах галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю МУС узбуджана крымінальная справа ў дачыненні да адказнай асобы Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Паводле папярэдняй інфармацыі, падазраецца гэты 44-гадовы сталічны жыхар у тым, што ў лістападзе 2006 года, працуючы на пасадзе начальніка аддзела згаданага камітэта, ён злоўжыў службовым становішчам, у выніку чаго дзяржаве быў нанесены ўрон у памеры 52 млн 600 тыс. рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### З НАЖОМ — НА НЕМАЎЛЯ

У вёсцы Навасёлкі Ляхавіцкага раёна адбылося сапраўднае дзікунства: жанчына падазраецца ў тым, што параніла нажом хлопчыка 2008 года нараджэння. Здарэнне зафіксавана каля а паловы дзевятай раніцы. 34-гадовая жанчына, грамадзянка Расіі, якая мае пасведчанне на права жыхарства ў Беларусі, у сваім доме, як мяркуецца, нанесла раненне брушной поласці малому пляменніку. Падазроная знаходзілася ў стане алкагольнага ап'янення. Немаўля змешчана ў бальніцу, а жанчына затрымана.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания ателье № 5, об. пл. 155,0 кв.м, расположенное: г. Слуцк, ул. Жукова, д. 21. Площадь зем. участка 0,0595 га. Начальная цена с НДС – 80 000 000 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.02.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 17.06.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 16.06.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже: здания дома животноводов об. пл.152,3 кв.м, здания коровника об. пл. 852,0 кв.м, расположенных: Логойский р-н, д. Заколюжье. Площадь зем. участка 0,8662 га. Начальная цена снижена на 50 % и составляет — 63 395 500 бел. рублей с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.02.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 20.05.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19.05.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже имущества, расположенного по адресу: Солигорский р-н, г.п. Старобин, ул. Краснознаменная, 87 (пл. зем. уч. 1,3026 га), в том числе площадка с навесом (843 кв.м), гараж типовой (387,4 кв.м), здание пилорамы с лесопильным цехом (258,8 кв.м), здание лесопильного цеха (245,3 кв.м), административного здания (70,8 кв.м), кузница (48 кв.м), сушильная камера (13 кв.м), проходная (8 кв.м), забор железобетонный (484 п.м.), вагон-общежитие (24,8 кв.м), дом-вагон ЗПТ (24,4 кв.м); транспортные средства: грузовые автомобили (ЗИЛ-441510, УАЗ-330301, ГАЗ-5312), полуприцепы (ТЦ-10А, КАЗ 717, ОДАЗ 885, СЗАП 9327, 2ПТС-4, ГКБ 817), легковой автомобиль (ВАЗ-2107), трактор МТЗ-80, погрузчик 4081; деревообрабатывающее оборудование, оргтехника, мебель и др. Начальная цена снижена на 23 % и составляет – 170 000 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.03.2008 г. **Аукцион состоится 28.05.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 27.05.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны: (8017) 224 61 34, (80293) 659569.
Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже следующего имущества, находящегося по адресу: г. Молодечно, ул. В. Гастинец, 143: ЛОТ № 2 — трактор МТЗ-50, ЛОТ № 4 — прицеп тракторный самосвальный 2ПТС-4 и ЛОТ № 5 — сушилка СПВ-62. Начальные цены снижены на 20 % и составляют соответственно: 4 566 000, 2 620 000 и 8 376 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 07.02.2008 г. **Аукцион состоится 27.05.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.05.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 2246134.
Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

14 мая 2008 г.
№ 18 (121)


«МС» ВЫСТУПИЛА. ЧТО СДЕЛАНО?

## ПОРЯДОК НАВЕДЕН. ЗАДОЛЖЕННОСТИ ОСТАЛИСЬ...

**В № 13 «Местного самоуправления» под рубрикой «Форс-мажор» была опубликована статья «Плацяжы разладу», где речь шла о последствиях ремонта теплотрассы, который еще прошлой осенью проводил Могилевский «Жилкомхоз» по улице Центральной в д. Новое Пашково Могилевского района. Редакция получила ответ на статью, подписанный заместителем председателя Могилевского райисполкома Н.А. Фоминым.**

«Могилевский райисполком рассмотрел статью «Плацяжы разладу», опубликованную 02.04.2008 г. (автор Илона Иванова) и сообщает о том, что Могилевским УКП «Жилкомхоз» в октябре—ноябре 2007 г. при прокладке новой теплотрассы, проходящей по внутренней территории домов № 1, 3, 5 по ул. Центральная в д. Новое Пашково Могилевского района, была раскопана придомовая территория возле д. № 5, где проживает Инна Борейко. До начала проведения работ она была предупреждена, что мероприятия по наведению порядка будут производиться силами работников предприятия. С этой целью был привезен грунт, изготовлен забор, был заказан цементный раствор для ремонта отмостки. Однако по объективным причинам (неблагоприятные погодные условия) завершить работы в срок не представилось возможным. Наведение порядка на придомовой территории стояло на контроле. В настоящее время произведена планировка территории, забор восстановлен, отремонтирована отмостка вышеназванных домов.

К дисциплинарной ответственности лица, виновные в несвоевременном принятии мер по наведению порядка возле дома Борейко И., не привлекались, т.к. начальник теплового отдела Мороз В.А. и начальник участка Парунов Э.Г. с работы уволены.

Начальникам и мастерам структурных подразделений Могилевского УКП «Жилкомхоз» указано на необходимость вежливого и тактичного обращения с гражданами, недопущение бездушного отношения к людским нуждам. По каждому случаю формализма, бестактного обращения, грубости, волокиты будут проводиться проверки, и в случае подтверждения таких фактов к виновным лицам будут применены самые строгие меры дисциплинарного воздействия.

В соответствии с Жилищным кодексом РБ обязанности по ремонту внутри квартиры возложены на квартиросъемщиков.

Факт о том, что по ул. Хроменкова есть дом, где сгнили трубы, подающие воду на второй этаж (поэтому люди не пользуются водой и канализацией, а носят воду ведрами с первого этажа), не соответствует действительности. В ходе проверки установлено, что по ул. Хроменкова, д. 19, кв. 8 проживает семья Скляровых, имеющих задолженность перед жилищно-коммунальным предприятием за оказанные коммунальные услуги в сумме более 3 млн рублей, в связи с чем оказание коммунальных услуг этим квартиросъемщикам приостановлено. Поэтому Скляровым приходиться брать воду на первом этаже, если соседи разрешат. Других фактов в ходе проверки не установлено.

В д. Новое Пашково имеются жилые дома, где отопление производится автономно. Случаи отключения от центрального отопления происходили из-за высокой стоимости. В настоящее время часть этих жильцов обратилась в Могилевский УКП «Жилкомхоз» с просьбой подключить их дома к центральному отоплению. Вместе с тем следует отметить, что случаи нарушения температурного графика и графика подачи горячей воды действительно имели место. По этим фактам произведены перерасчеты, что отражено в квитанции об оплате.

Подбор, расстановка и обучение кадрового состава в Могилевском УКП «Жилкомхоз» всегда находятся на особом контроле. Действительно, за последние 4 года было уволено с работы 3 начальника участка. (Увольнения происходили по чисто субъективным причинам.)

Для сведения сообщаем, что по состоянию на 01.04.2008 года задолженность жителей д. Новое Пашково по коммунальным услугам перед Могилевским УКП «Жилкомхоз» составляет около 26 млн рублей, в том числе Борейка И. — 113 тыс. рублей».

## НЕ БЫЛО Б БЯДЫ, КАЛІ Б НЕ ЯКАСЦЬ ВАДЫ

**Бюджэт Бяларуцкага сельвыканкама Лагойскага раёна фарміруецца за кошт паступленняў з васьмі крыніц ( у тым ліку зямельнага падатку, падатку на нерухомасць з фізічных асобаў, дзяржпошліны). Аднак асноўны даход сельвыканкам атрымлівае ад прыватызацыі зямлі і продажу ўчасткаў праз аўкцыёны.**

### Трохбаковы дагавор

— Многія грамадзяне, якія калісьці атрымалі ўчасткі ў пажыццёва-спадчыннае ўладанне, сёння актыўна афармляюць іх у прыватную ўласнасць, — тлумачыць старшыня Бяларуцкага сельскага Савета дэпутатаў Таіса Лявончык. — Для гэтага яны павінны выплаціць сельвыканкаму суму ў памеры кадастравага кошту зямлі. Напрыклад, за 15 сотак, размешчаных на тэрыторыі сельсавета, трэба выкласці каля 2 млн рублёў. Для нас гэта вялікія грошы.

Што датычыцца продажу зямлі, пакуль у Бяларуцкім сельсавеце прайшоў толькі адзін аўкцыён — у лістападзе мінулага года. Выстаўляліся 6 участкаў у вёсцы Мачаны. Прырода там — цуд ды і толькі (возера Вяча, лес). Створана першасная інфраструктура, ёсць электрычнасць, падводзіцца газ.

— Зараз працуем над бурэннем дзвюх свідравін, — працягвае старшыня. — Гэта раён новай катэджнай забудовы ў межах населенага пункта. Там павінны быць свае свідравіны.

Паводле слоў Таісы Лявончык, ахвотнікі набыць памянёныя ўчасткі знайшліся хутка: удзел у лістападаўскім аўкцыёне ўзялі 23 чалавекі. Крок лота складаў 500 тысяч рублёў, аднак ён у большасці выпадкаў не вытрымліваўся: удзельнікі набаўлялі цану адразу па два-тры крокі. Прыбытак сельвыканкам атрымаў відавочны. Так, самы вялікі ўчастак — 14 «сотак», выстаўлены на аўкцыён па цане 5,5 млн рублёў, у выніку быў прададзены за 40 млн. Агульная сума прыбытку ад 6 участкаў склала 185 млн рублёў.

Падрыхтоўка да аўкцыёну патрабуе пэўных затрат. У прыватнасці — на афармленне адпаведнай дакументацыі на кожны ўчастак. У сельвыканкаме грошай на гэтыя мэты не было. Там пайшлі па іншым шляху: заключылі трохбаковы дагавор пераводу пазыкі з праектнай арганізацыяй. Яна рыхтавала патрэбныя дакументы, а расходы потым аплачваў пераможца аўкцыёна. Са свайго бюджэту сельвыканкаму давялося патраціць толькі 700 тысяч рублёў — на рэгістрацыю ўчасткаў, што выстаўляліся, у кадастравым агенцтве.

Цяпер Таіса Антонаўна рыхтуецца да новага аўкцыёну, які адбудзецца ў маі. У якасці лотаў будуць выстаўлены 7 участкаў, размешчаных у трох вёсках — Мачаны, Маркаўшчына і Прудзішчы. У Маркаўшчыне гэта раён новай катэджнай забудовы. У Прудзішчах — 25 сотак у цэнтры вёскі.

У планах старшыні прадугледжана правядзенне яшчэ аднаго аўкцыёну (бліжэй да канца лета) — у аддаленых населеных пунктах.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

## «ЛЕПШАЙ ЗА МАЮ ВЁСКУ НЯМА!»

**— кажа стараста Мікалай Стараверaў. І з ім цяжка не пагадзіцца.**

Ён жадае, каб усе жыхары вёскі Магільна Уздзенскага раёна думалі гэтаксама і клапаціліся пра знешні выгляд населенага пункта, а па меры магчымасці прыкладалі і свае намаганні. Па-першае, сачылі за парадкам, дапамагалі добраўпарадкаваць вуліцы, на якіх жывуць. Перад Радаўніцай вяскоўцы дружна адгукнуліся на прапанову старасты прыбраць могілкі. А яшчэ ён абышоў усе падворкі, пагаварыў з кожным гаспадаром — і ніхто не адмовіўся зрабіць свой невялікі матэрыяльны ўнёсак (па пяць тысяч рублёў), каб быў арганізаваны рэгулярны вываз смецця, перыядычна рамантаваліся агароджы, азеляняліся вуліцы. Ды і сваім уласным падворкам з каменьчыкам, на якім вывеў словы народнага песняра, Мікалай паказвае сапраўдны прыклад аднавяскоўцам.

Двум адзінокім старым, ветэранам вайны, вясковы стараста дапамог з гарачымі бясплатнымі абедамі штодня ў сталоўцы мясцовага СВК. А яшчэ перад Вялікаднем звярнуліся да яго жыхары суседняй вёскі з просьбай, каб аўтакрама да іх прыйшла да свята. Сеў за тэлефон, набраў нумар прыватнага гаспадара аўтакрамы — і на свята былі ў пенсіянераў і свежыя прадукты, і велікодныя кулічы, і яйкі. Колькі падзяк было за гэта старасту!..

Усяго некалькі прыкладаў — але адразу разумееш, чаму ў Магільным Нёманскага сельсавета на грамадскай пасадзе ўжо трэці год менавіта Мікалай Стараверaў.

У вольны ад клопатаў час стараста з задавальненнем займаецца любімым відам творчасці — паэзіяй. Аднавяскоўцы ведаюць, што адзін з вершаў Мікалая Старaверава пакладзены на музыку і быў прызнаны лепшым творам на абласным і рэспубліканскім аглядах народнага мастацтва. Там ёсць такія радкі:

«Хай з кожным днём прыгажэе
Уздзенскі край дарагі!
І хай у кветках квітнеюць
Нёманскія берагі!»

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**



## АГРАТУРЫЗМ З МІНІМАЛЬНАЙ РЫЗЫКАЙ

**Нягледзячы на значныя ўкладанні ў аднаўленне замкаў, палацаў, колішніх панскіх сядзібаў і храмаў, задача «дагнаць і перагнаць» Еўропу па колькасці старажытных помнікаў архітэктуры ў бліжэйшыя гады падаецца практычна невырашальнай. Затое на рынку турыстычных паслуг мы маем іншыя, не менш важкія перавагі — унікальную прыроду і спрадвечны каларыт беларускай вёскі. Рана ці позна попыт на гэты від адпачынку з'явіцца, ёсць і першыя прапановы. Прынамсі, у Чавускім раёне ўжо прынятае рашэнне стварыць як мінімум па адным аб'екце аграэкатурызму на тэрыторыі кожнага сельсавета.**

### Назад, у вёску

Амаль трыццаць кіламетраў на поўнач ад райцэнтра. Кажуць, што яшчэ гадоў сто таму вёска Хонькавічы была па-сапраўднаму вялікай, яе насельніцтва складала каля паўтысячы чалавек, тут была свая кузня, працавала царкоўна-прыходская школа. Але цяперашні малюнак іншы. Ва ўсёй вёсцы налічваецца пад тры з паловай дзесяткі «жылых» двароў, а што да адметнасцяў, то да іх варта аднесці хіба што краму і... сядзібу сям'і Хліманковых. Прычым цікава: гаспадары, Анатоль Максімавіч і Людміла Аляксандраўна, перабраліся сюды з Магілёва.

Пасля заканчэння сельгастэхнікума Людміла Аляксандраўна патрапіла ў Хонькавічы па размеркаванні. На той час Анатоль Максімавіч пакінуў ужо родную вёску і працаваў у абласным цэнтры на заводзе, аднак рэгулярна прыязджаў да бацькоў. У рэшце рэшт, так яны пазнаёміліся, узялі шлюб, а затым, ужо разам, падаліся ў больш прывабны горад. Уладкаваліся, нарадзілі траіх дзяцей, атрымалі кватэру. І, нібыта, усё было добра, калі б не адно — цягнула назад, у вёску.

— Яшчэ ў сярэдзіне 90-х мы вырашылі ўзяць у Хонькавічах кавалак зямлі і пачаць будаўніцтва ўласнага дома «пад дачу», — распавядае Анатоль Хліманкоў. — Аднак у выніку «часовы варыянт» стаў пастаянным. Дзеці засталіся ў горадзе, а мы два гады таму перабраліся жыць у вёску. Тым больш, што тут заставаліся мае бацькі, а Людміла, аграном па адукацыі, была прадпрымальнікам і мела ў раёне сваю невялікую справу — займалася насеннем кветак, дэкаратыўных раслін і агародных культур.

### Авантурыст — не варыянт

Бізнэс па сутнасці стаў сямейным і ідзе паспяхова дагэтуль — за насеннем стаяць чэргі. Разам з тым, сёлета Хліманковы пачалі асвойваць яшчэ адзін, ужо новы накірунак. Параду звярнуць увагу на аграэкатурызм даў старшыня сельвыканкама. А пасля сям'я параілася і вырашыла: «Чаму б і не?»

— Магчыма, Хонькавічы і не надта прывабныя ў выключна гістарычным плане, але пагадзіцеся, што ў дадзеным выпадку гэта далёка не галоўнае, — працягвае Анатоль Хліманкоў. — Больш важна, што тут заўсёды ціха, што за дзесяткі кіламетраў адсюль няма ніводнага буйнога прамысловага прадпрыемства, што ў адрозненні ад многіх населеных пунктаў Магілёўшчыны вёску не закранула чарнобыльская пляма. А яшчэ тут па-сапраўднаму цудоўныя мясціны. У вёсцы ёсць рэчка, ёсць невялікае, але багатае на рыбу возера, зусім побач лес з ягадамі, грыбамі і дзічынай — зайцамі, лісамі і дзікамі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС.»)*

## ОТХОДЫ ИЛИ ДОХОДЫ?

**В «Местном самоуправлении» за 19.03.2008 г. была опубликована статья «Чаму адходы не ідуць у даходы?», где рассказывалось о проблемах, с которыми регулярно приходится сталкиваться коммунальному унитарному предприятию «Экскомуслуги» Колодищанского сельисполкома Минского района.**

Ознакомившись со статьей «Чаму адходы не ідуць у даходы?», Минское областное унитарное предприятие «Управление жилищно-коммунального хозяйства» сообщило редакции следующие факты.

«Решением Минского райисполкома от 26.02.2004 г. № 235 в Минском районе созданы 19 коммунхозов на базе сельских исполкомов, работа которых вместе со службами жилищно-коммунального хозяйства района позволила обеспечить 100-процентный охват планово-регулярной очисткой от отходов территорий населенных пунктов. Из них 8 оформлены как юридическое лицо, 11 — функционируют как коммунальные подразделения при сельских исполкомах. Одно из направлений деятельности коммунхозов — сбор и утилизация ТБО от населения, предприятий и организаций, расположенных на территории сельского Совета.

Главными проблемами в существовании данных коммунальных предприятий, в том числе КУП «Экскоммунуслуги» Колодищанского сельского Совета, является отсутствие необходимой правовой базы для их функционирования и недостаток финансирования.

КУП «ЖКХ Минского района» оказывает услуги 50 200 абонентам по вывозу твердых бытовых отходов. Вывоз производится согласно графиков. В настоящее время заключено 419 договоров на вывоз и обезвреживание твердых бытовых отходов.

Решением Минского районного Совета депутатов от 18.03.2008 г. № 98 «Об утверждении Мероприятий по наведению порядка на земле и благоустройству территорий населенных пунктов» определены мероприятия по совершенствованию системы обращения с коммунальными отходами.

В целях исполнения решения Минского областного Совета депутатов № 90 от 03.04.2008 г. активизирована контрольная работа административной комиссии Минского райисполкома, Минской райинспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды и ГУ «Минский зональный центр гигиены и эпидемиологии» за надлежащим санитарным содержанием земель общего пользования и территорий предприятий, соблюдением физическими и юридическими лицами законодательства.

**П.В. ПАРХОМЕНКО,**
**исполняющий обязанности генерального директора Минского областного УП «Управление жилищно-коммунального хозяйства».**

## ШКОЛА Ў ГЛЫБІНЦЫ

Апошнім часам ездзіць па раёнах прыходзіцца нямала, але не скажу, каб часта даводзіся бачыць драўляную школу. А ў Лышчы, у самай глыбінцы Палесся, на мяжы Пінскага і Ганцавіцкага раёнаў, школа, пабудаваная ў 1952 годзе, выглядае зусім прыстойна. Тут займаецца 99 вучняў, працуе 19 настаўнікаў. І ўсе яны любяць сваю школу. Драўляны будынак дагледжаны як звонку, так і знутры. Паводле слоў дырэктара Лышчанскай сярэдняй школы Сяргея Ладыгі, рамонт дапамагаюць рабіць мясцовы СВК і сельсавет. Кіраўнік гаспадаркі — Казімір Лінкевіч і ўлады — Таццяна Маркевіч бываюць тут не толькі на ўрачыстых лінейках.

А ўпрыгожыць, добраўпарадкаваць тэрыторыю выходзяць кожную вясну дзеці разам з настаўнікамі. І школьны двор патанае ў зеляніне і кветках. Прыгажосць тут «гадуюць» не толькі для сябе. Расаду кветак школа рэалізуе ўсім установам і вёскам сельсавета.

У Лышчы вельмі шануюць сваю гісторыю і ганарацца выпускнікамі, сярод якіх шмат знакамітых людзей. Вучоныя, дзяржаўныя дзеячы, Героі Сацыялістычнай Працы закончылі ў свой час Лышчанскую школу Пінскага раёна. У ліку выпускнікоў нямала і творчых людзей, тых, хто звязаў лёс з мастацтвам, вучняў выкладчыка малявання Канстанціна Прыгодзіча. Канстанцін Іванавіч не толькі вучыў дзяцей, але ўсё жыццё пісаў партрэты, пейзажы, нацюрморты. А нядаўна вялікую калекцыю карцін настаўнік-пенсіянер падарыў любімай школе. І цяпер сцены першага паверха ўпрыгожвае галерэя. Кожны з партрэтаў можна разглядаць доўга і спрабаваць угадваць лёс яго героя. Галерэя надае калідорам старой школы асаблівую задумлівую ўрачыстасць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

## САМАКІРАВАННЕ ВЕЛЬМІ ДОБРА АКУПЛЯЕЦЦА



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

**З нядаўніх часоў вуліца Паркавая, што знаходзіцца на ўсходняй ускраіне Баранавічаў, стала вядомай не толькі за межамі гэтага горада, але і вобласці. Менавіта тут, дзякуючы ініцыятыве і актыўнасці дэпутата гарсавета Анатоля БАНКЕВІЧА, быў створаны першы (і адзіны ў рэспубліцы) камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання «Надзея».**

Справа, безумоўна, не ў самім факце яго рэгістрацыі — колькі зарэгістраваных фарміраванняў спакойна існуюць... на паперы? Справа ў тым, што сёння жыхары 15 кааператыўных дамоў, аб'яднаныя ў новую структуру, аплачваюць добраўпарадкаванне сваёй тэрыторыі з уласных кішэняў. І пры гэтым усе задаволены — і людзі, і мясцовыя ўлады.

...Анатоль Іосіфавіч Банкевіч са своеасаблівым гонарам дэманструе мне, так бы мовіць, мясцовае самакіраванне ў дзеянні: зялёны газон, заасфальтаваныя пешаходныя дарожкі, пляцоўкі для кантэйнераў, абнесеныя акуратнай агароджай, ліхтары, прымацаваныя да дахаў і сцен дамоў, новенькія лавачкі ля пад'ездаў... Уласна кажучы, парадкам на дваровых тэрыторыях сёння ўжо не здзівіш нікога. Але ў пераважнай большасці выпадкаў ён забяспечваецца — лепш ці горш — дзякуючы фінансавым укладанням мясцовай улады і стараннем ЖЭСаў... Жыхары вуліцы Паркавай не сталі сядзець ды на неба глядзець.

Мікрараён Усходні ў горадзе — самы малады, кааператыўныя дамы на Паркавай узводзіліся на пачатку 2000-х. Здалі іх у «лепшых» традыцыях: навокал развал, замест асфальтаванага пакрыцця — зямля ўперамешку з пяском, ніякага добраўпарадкавання... З аўтобуснага прыпынку да сваіх пад'ездаў людзям даводзілася хадзіць у прыцемках... Пасыпаліся скаргі ў ЖЭС, выканкам, гарсавет...

— Ведаеце, дзе можа стварыцца орган тэрытарыяльнай самаарганізацыі, тэрытарыяльнага самакіравання? — пытаецца Анатоль Іосіфавіч. І сам адказвае: — Толькі там, дзе ёсць жаданне людзей аб'яднацца вакол чагосьці. А аб'яднацца можна толькі вакол нейкай праблемы.

Вось і вырашылі жыхары шматпавярховікаў аб'яднацца вакол праблемы асвятлення сваіх двароў, паколькі, у адпаведнасці з сённяшнімі патрабаваннямі, мясцовыя ўлады павінны забяспечваць толькі асвятленне вуліц. Анатоль Банкевіч выступіў ініцыятарам і арганізатарам такога аб'яднання.

Знайшоўся і патэнцыяльны спонсар — Сусветны банк, які ў 2003 годзе аб'явіў конкурс праектаў.

— Мы разам з гарадскім экалагічным саюзам падрыхтавалі невялікі праект, дзе прапанавалі шляхі вырашэння праблем па добраўпарадкаванні менавіта самімі грамадзянамі, — расказвае Анатоль Банкевіч. — Асвятленне двароў «цягнула» на круглую суму, і мы бачылі, што ўлады не ў стане прафінансаваць грамадзянам такое задавальненне. А пад праект банк выдзеліў нам пэўную суму грошай, за кошт якіх ужо можна было аплаціць 50 працэнтаў усіх неабходных затрат на асвятленне. Пры ўмове, што 30 працэнтаў гэтых затрат павінны былі прафінансаваць самі жыхары. Ну а астатнія 20 працэнтаў пагадзіліся кампенсаваць органы мясцовай улады.

Ліхтары асвятлення жыхары вырашылі ўсталяваць не на слупах (каб зэканоміць на кабелі, правадах і адпаведных работах), а адразу на дамах. Таму аплата за асвятленне, якое «з'ядае» ліхтар, з самага пачатку размяркоўвалася паміж усімі жыхарамі дома. Сума аказалася настолькі нязначнай, што за тры гады ніхто ні разу не паскардзіўся на «перавышэнне аплаты» за электрычнасць.

Ад моманту ўзнікнення ідэі з устаноўкай ліхтароў да моманту яе ўвасаблення прайшоў практычна год. Увесь гэты час праводзіліся сустрэчы ініцыятыўнай групы з жыхарамі пад'ездаў і дамоў: выслухоўваліся ўсе сумненні, меркаванні, парады...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

**Да такой высновы прыйшлі ў Баранавічах пасля таго, як тут быў створаны камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання**

# СТАРЫ МЛЫН ЯШЧЭ ПАСЛУЖЫЦЬ...

**Пры належнай «раскрутцы» айчынныя адметнасці маюць усе шанцы стаць паўнаважкім турыстычным прадуктам. І становяцца. У гэтым пераканаўся падчас камандзіроўкі на Маладзечаншчыну, калі зусім нечакана для сябе патрапіў у вёску, якая размяняла дзевятае стагоддзе...**



*Старшыня Гарадоцкага сельскага Савета Пётр МАРОЗ.*

### З Гарадца — у Гарадок

Вёска Гарадок упершыню ўзгадваецца ў вядомым Іпацьеўскім летапісе. Вядома, пра пэўную колькасць населеных пунктаў мы даведаліся праз гісторыю ваенных дзеянняў. Так і з Гарадком. Толькі ў 1162 годзе (паводле іншых крыніц у 1161-м) гэта была не вёска, а самы сапраўдны горад. Праз бітву, апісаную летапісцам, стала вядома пра Гарадзец. Менавіта з гэтым старажытным памежным горадам полацкай зямлі гісторык Данілевіч атаясамлівае адну з вёсак пад Маладзечнам. З цягам часу з Гарадца яна «пераўтварылася» ў Гарадок. Вёска дасюль захавала сваю адметнасць. Бадай, ці не самая галоўная — гарадзішча, якое месцічы дасюль называюць «замкам».

Кажуць, што яшчэ напрыканцы XVIII стагоддзя тут працавала цагельня, а ў пачатку XIX — суконная мануфактура і заводзік па выпрацоўцы медзі. Але 21 мая 1865 года адбыўся вялікі пажар, агонь знішчыў многія пабудовы, згарэла і Свята-Троіцкая царква. Дарэчы, у 1874 годзе на гэтым жа месцы ўзвялі новую мураваную царкву (яна захавалася дасюль). Паступова мястэчка акрыяла — працавалі піваварны завод, 22 лаўкі, пастаялы двор, народнае вучылішча (імкненне да навукі, бачым, было вялікае), на левым беразе Бярэзіны размяшчаўся вадзяны млын. Факт, які мяне вельмі здзівіў: на працягу менш чым дваццаці гадоў (з 1880 па 1897) колькасць жыхароў павялічылася больш чым у восем (!) разоў і пера-



сягнула 1,5-тысячную мяжу. Кожны аўторак у мястэчка на таржок з'язджаліся гаспадары, якія мелі што прапанаваць да продажу. Увогуле, народ тут надта прадпрымальны: кажуць, што быў распаўсюджаны гандаль медыцынскімі п'яўкамі — іх адпраўлялі за мяжу!

### Піфагор і агратурызм

У пачатку мінулага стагоддзя ў мястэчку працавалі тры скураныя заводы і тры заводы па вырабе глінянага посуду, а таксама вытворчасць мінеральнай і газаванай вады. Кірмашы збіраліся ўжо двойчы на тыдзень — па аўторках і серадах... У старшыні Гарадоцкага сельскага Савета Пятра Мароза захаваўся адметны здымак 1920-х гадоў: месцічы сабраліся на «фотасесію» на галоўную плошчу Гарадка. Усе ў добрым адзенні (ніводнага няма ў лапцях), многія трымаюць веласіпеды. Цікава, што частка дамоў, якія бачныя на здымку, захаваліся ў такім жа выглядзе дасюль. Аказалася, што драўляныя будынкі былі аднаўлены па арыгінальнай форме, што стварае мястэчку непаўторны «шарм» — тут сапраўды можна падарожнічаць па часе.

Пасля ваеннага ліхалецця вёска зноў (у які ўжо раз) пачала адраджацца. Сапраўдны яе росквіт звязваюць з поспехамі калгаса імя Калініна. Мне на вочы трапіў артыкул, прысвечаны 800-годдзю Гарадка, дзе вёску называлі «равесніцай Масквы». Акрамя жылля, у 1960-я актыўна ўзводзіліся і грамадскія будынкі — аптэка, пошта, чайная, камбінат бытавога абслугоўвання, лясніцтва. З таго часу, зразумела, шмат што змянілася і інфраструктура прыходзіць у заняпад — цяпер даводзіцца весці гаворку аб зносе будынка бібліятэкі, а таксама дамоў, якія не маюць гаспадароў. Цяпер у Гарадку засталіся 422 жыхары, чвэрць з якіх — пенсіянеры. За апошнія шэсць гадоў колькасць насельніцтва старажытнага мястэчка зменшылася роўна на сотню чалавек. Аднак тут не губляюць надзеі на аднаўленне былой велічы.

— Неабходна шукаць розныя варыянты, каб Гарадок атрымаў дадатковы стымул для актыўнага развіцця, — упэўнены Пётр Мароз. — Землі ў нас небагатыя, затое шмат лесу, экалогія добрая. У спалучэнні з гісторыяй мястэчка ўсё гэта стварае даволі прывабныя ўмовы для такога перспектыўнага і цікавага накірунку, як агратурызм. Трэба варушыцца: яшчэ некалі Піфагор казаў, што пачатак — палова ўсёй справы.

### Апартаменты ў стылі неаготыкі

Варыянты знайшлі вельмі арыгінальныя, незвычайныя, аднак, як аказалася, даволі дзейсныя. Справа ў тым, што на паўночным ускрайку Гарадка захаваўся вадзяны млын, які ўзведзены з цэглы і бутавага каменя напрыканцы XIX— пачатку XX стагоддзя. Двухпавярховы будынак лічыцца помнікам прамысловай архітэктуры з элементамі неаготыкі (мае адпаведныя стылізаваныя канструктыўныя элементы). Ёсць жорны для грубага і дробнага памолу зерня, механізм для тонкага памолу пшаніцы, а таксама крупэрня. На другім паверсе — склад для зерня, якое адтуль ссыпалі ў жорны. Планіроўка, можна лічыць, традыцыйная, аднак сам будынак выдзяляецца — стары млын заўважаеш адразу, як пад'язджаеш да Гарадка. Ён быццам ахоўвае мястэчка. Не дзіўна, што аднаўленне гістарычнай спадчыны пачалі менавіта адсюль.

Праз пэўны час тут з'явіцца цікавы турыстычны аб'ект. Праз аўкцыён млын выкупіла прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Белтрадыцыя». Як заўважае Пётр Мароз, прыйшлося прайсці завочны падрыхтоўчы курс па продажы нерухомасці. Падчас падрыхтоўкі да аўкцыёну ўсім яго ўдзельнікам дакладна растлумачылі галоўную ўмову — будынак неабходна не толькі аднавіць, але і выкарыстоўваць для арганізацыі турызму. Сталічная фірма менавіта так і зробіць: млын плануецца выкарыстаць для рэгістрацыі прыезджых, а на другім паверсе з'явяцца ўтульныя нумары для пражывання. На пад'ездзе ў Гарадок мяркуецца абуладкаваць сучасную аўтастаянку. Каля млына створаць цэлы турыстычны цэнтр — тут будзе пякарня, кузня, невялікая канюшня, драўляныя домікі для размяшчэння турыстаў, лазня. Навакольную тэрыторыю ўпрыгожаць альтанкамі, лаўкамі, праз рэчку зробяць масткі. Карацей кажучы, усё набудзе зусім іншы выгляд.

Выгада — узаемная: грошы, якія сельвыканкам выручыў ад аўкцыёну (гэта больш чым 46 мільёнаў рублёў), з розумам выкарыстаюць для добраўпарадкавання вёскі. У 2010 годзе Гарадок стане аграгарадком, аднак тут не чакаюць пэўнай даты, каб пачаць навядзенне парадку. Імкнуцца адысці ад традыцыйных, тыпавых формаў. Як лічыць Пётр Мароз, неабходна выкарыстоўваць сучасны ландшафтны дызайн. Напрыклад, зусім неабавязкова ўсю вуліцу «закрываць» агародкай, дзесьці можна зрабіць прыгожы дэкаратыўны поплаў, кветнік. Наваколле павінна песціць вока, каб усім спадабалася сюды прыязджаць. Дарэчы, ужо цяпер гэтыя мясціны карыстаюцца попытам — больш-менш трывалыя дамы ў Гарадку раскупілі.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**
*Маладзечанскі раён.*

# НЕ БЫЛО Б БЯДЫ, КАЛІ Б НЕ ЯКАСЦЬ ВАДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Неабходна «ўшчыльняць» такія вёскі, — тлумачыць Таіса Лявончык, — даваць ім імпульс для далейшага развіцця. Мясцовае насельніцтва старэе, спадчыннікі не вельмі спяшаюцца сюды вяртацца. Нашы сельскія населеныя пункты прырастаюць у асноўным за кошт сезонна пражываючых. Многія з іх актыўна прапісваюцца і на пастаяннае жыхарства — кажуць, што ад нас да месца працы ў сталіцы на машыне дабірацца больш зручна, чым праз гарадскія заторы.

Бюджэт Бяларуцкага сельвыканкама на 2008 год складае 69 млн рублёў. Большая частка гэтых грошай пойдзе на добраўпарадкаванне. Ужо адрамантаваны і пачышчаны 27 грамадскіх шахтных калодзежаў, закуплены агароджы для ўстаноўкі на могілках і ўздоўж вуліц населеных пунктаў. Напярэдадні дня Перамогі асаблівая ўвага была звернута на стан мемарыялаў і помнікаў загінулым воінам і ахвярам Вялікай Айчыннай. У месцах грамадскага карыстання ўстаноўлены металічныя інфармацыйныя шчыты, у парках і скверах — малыя архітэктурныя формы (альтанкі, лавачкі, скульптуры). Пэўная сума бюджэтных сродкаў пойдзе на рамонт адміністрацыйнага будынка сельвыканкама.

Грошы, зробленыя на аўкцыёне, дэпутаты вырашылі патраціць на дапамогу дзвюм мясцовым школам (падлатаць дах). Тое, што застанецца, пойдзе зноў жа на добраўпарадкаванне тэрыторыі сельсавета.

### Цудоўная аўтаматыка

Усяго ў Бяларуцкім сельсавеце 18 населеных пунктаў. У дзевяці з іх пракладзены водаправод. Сеткі — як і ўсюды ў вёсцы — зношаныя, часам здараюцца парывы. Каб пазбегнуць залішняй нагрузкі на трубы, было набыта спецыялізаванае аўстрыйскае абсталяванне — частотныя пераўтваральнікі.

— Цудоўная аўтаматыка рэгулюе ціск у сетцы і абараняе яе ад парыву, — з гонарам расказвае Таіса Антонаўна. — Частотны пераўтваральнік змякчае гідраўлічны ўдар і кампенсуе перапады напружання ў сістэме. А самае галоўнае — у нас перасталі гарэць глыбінныя помпы. Падоўжыўся тэрмін іх службы. Аўстрыйскай аўтаматыкай мы «закрылі» праблему па шасці вёсках. У астатніх часам яшчэ здараюцца парывы водаправоду, але аварыі ўстараняюцца ў рабочым парадку.

Куды больш засмучае старшыню нездавальняючы стан вады ў многіх вёсках, высокая канцэнтрацыя жалеза:

— У Алекшыцах сітуацыя была вельмі няпростая. Вада там заўсёды цякла ржавая. Канцэнтрацыя жалеза перавышала норму ў шмат разоў. Ламаліся пральныя машыны, людзі не маглі адмыць бялізну, скардзіліся. Мы дэталёва вывучылі гэтую сітуацыю. Прыйшлі да высновы, што ў многім праблема была абумоўлена нездавальняючым станам воданапорнай вежы. Адсутнасць рэгулярнай прамыўкі і ачысткі паступова прывялі да таго, што вежа напалову запясочылася. Калі ж мы «адрэзалі» яе ад цэнтральнага водаправода, якасць вады палепшылася. Аналагічна прыйшлося паступіць яшчэ з некалькімі вежамі. Тыя, што знаходзіліся ў спраўным стане, мы не чапалі. Нам даўно патрэбна станцыя абезжалезвання, аднак гэта — вялікія грошы. Самі мы яе не «пацягнем», а ў абласную праграму «Чыстая вада» мы не ўключаны, — падсумавала Таіса Антонаўна.

Згодна з Указам Прэзідэнта № 21, усе водаправодныя і каналізацыйныя сеткі і свідравіны на тэрыторыі сельсавета былі перададзены на баланс раённых камунальных службаў. Падрыхтавана дакументацыя і на перадачу дарог і вуліц сельскіх населеных пунктаў. Пакуль суд ды справа, жыхары раёнаў новай катэджнай забудовы самі клапоцяцца аб стане пад'ездаў да сваіх дамоў: набываюць «крошку», драбнёны асфальт, умацоўваюць дарогі.

### ...І маштабны праект

Сёння на тэрыторыі сельсавета няма аб'ектаў аграэкатурызму, аднак старшыня ўпэўнена, што сітуацыя хутка зменіцца. Адсутнасць радыяцыйнага забруджвання, прыгожыя краявіды, наяўнасць інфраструктуры і камунікацый стварылі надзвычай спрыяльныя ўмовы для развіцця сельскага турызму. Вясковыя жыхары паступова ўсведамляюць выгоды свайго месцапражывання і ўжо звяртаюцца ў сельвыканкам па інфармацыю — як распачаць сваю справу. Ёсць праект (праўда, толькі на паперы) турыстычнага маршруту «Экалагічная сцяжына», які павінен аб'яднаць Мінскі і Лагойскі раёны. Плануецца, што ён «зачэпіць» і Бяларуцкі сельсавет.

Шмат спадзяванняў Таіса Антонаўна ўскладае на Парк гібрыдных экатэхналогій. Даўно наспела ў старшыні такая задума: аб'яднаць у адным комплексе адпачынку найноўшыя тэхналогіі і элементы даўніны.

— Гэта тэрыторыя ў 5 гектараў, дзе ёсць крыніца, возера. Надзвычай прыгожае месца, — дзеліцца ідэяй Таіса Антонаўна. — Там можна было б арганізаваць парк скульптуры, устанавіць міні-ГЭС для асвятлення комплексу. Да нас прыязджалі навукоўцы з Нацыянальнай акадэміі навук, цікавіліся канцэпцыяй праекта. Яны пацвердзілі, што для міні-ГЭС перападаў вады тут хопіць. Мы правялі анкетаванне насельніцтва, высветлілі, што людзі рады былі б такому парку. Застаецца знайсці інвестара, бо ў нас саміх грошай на такі маштабны праект не хопіць.

— Бяларуцкі сельсавет мае вельмі выгаднае размяшчэнне, — выказаў свае меркаванні старшыня Лагойскага раённага Савета дэпутатаў Іван Карповіч, — зямля тут запатрабаваная. Будзем спадзявацца, што сюды прыйдуць салідныя інвестары, якія будуць укладаць сродкі ў развіццё мясцовых населеных пунктаў і аб'ектаў аграэкатурызму.

**Інга МІНДАЛЁВА,**
*Лагойскі раён.*

# САМАКІРАВАННЕ ВЕЛЬМІ ДОБРА АКУПЛЯЕЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Можна было, безумоўна, адразу заплаціць грошы той ці іншай фірме, прывезці гэтыя ліхтары, там-сям прыляпаць — ды і Бог з імі, — разважае Анатоль Іосіфавіч. — Але ж наша мэта была ў іншым: каб усе, нават самыя дробязныя рашэнні, людзі прымалі самі. Каб вучыліся браць на сябе адказнасць. На тым этапе ўзнікла і пытанне афіцыйнай рэгістрацыі арганізацыі. Людзі збіраюць грошы — а пад што? І як афарміць гэтыя сродкі далей? А калі прыйдзе падатковая інспекцыя і спытае: куды вы іх падзелі? Усё ж 15 кааператыўных дамоў задзейнічана... Ды і арганізацыя, якая займалася ўстаноўкай ліхтароў, павінна была заключыць дагавор з канкрэтнай юрыдычнай асобай...

Так у 2003 годзе, у адпаведнасці з Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», узнік камітэт тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КТГС) «Надзея». Арганізацыя зарэгістравалася як юрыдычная асоба, распрацавала палажэнне, статут, адкрыла рахунак... Ідэю падтрымалі і ў гарадскім Савеце дэпутатаў, паколькі «Надзея» добраахвотна перакладвала на свае плечы частку клопатаў мясцовай улады.

— А чым вас дамавыя камітэты не задавальнялі? — пацікавілася я ў Банкевіча. — Навошта быў патрэбны гэты галаўны боль са стварэннем КТГС?

— Дамавы камітэт дапамагае ЖЭСу сачыць за парадкам, за маёмасцю, жыллёвым фондам... Але ён не ў стане вырашаць праблемы тэрыторыі — добраўпарадкаванне двара, якасць асвятлення, наяўнасць дзіцячых пляцовак і іншае. Між тым, тэрытарыяльнае грамадскае самакіраванне — гэта аптымальны варыянт супрацоўніцтва паміж грамадзянамі, якія пражываюць на тэрыторыі, і мясцовай уладай. Без падтрымкі ўлады вынікаў, безумоўна, не будзе, — лічыць Анатоль Банкевіч. — У нашай рэспубліцы, на жаль, на месцах гэтым мала хто цікавіцца. Шкада. Бо самакіраванне вельмі добра акупляецца, паколькі людзі самі, за свае грошы, вырашаюць шэраг праблем.

Паралельна «Надзея» пачала рэалізоўваць і іншыя праекты — уклалі грошы ў развіццё дваровага спорту, у падтрымку маламаёмасных жыхароў. Апошнім (а гэта ў асноўным пенсіянеры і шматдзетныя сем'і) аказалі дапамогу ў правядзенні рамонту: адным купілі шпалеры, другім — фарбу. Нікога не пакрыўдзілі...

Ды толькі ў 2007 годзе камітэт вымушаны быў... прыпыніць сваю дзейнасць. Своеасаблівым «бар'ерам» для яго стаў той самы артыкул у Законе «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», у адпаведнасці з якім органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання выбіраюцца на тэрмін, які адпавядае тэрміну склікання мясцовага Савета дэпутатаў. (Тэрмін мінулага склікання скончыўся ў студзені 2007 года.) Пасля гэтага Саветы перавыбіраюцца, а органы грамадскага самакіравання... ліквідуюцца.

— Не перарэгіструюцца, а менавіта ЛІКВІДУЮЦЦА! — хвалюецца Анатоль Банкевіч. — Вы разумееце, што такое для юрыдычнай асобы прайсці праз ліквідацыю і на які тэрмін гэта можа зацягнуцца? І галоўнае — у чым тут сэнс? Ліквідавацца... каб потым стварацца зноў? У камітэта ёсць два камп'ютары, мэбля, іншая ўласнасць, валютны рахунак, бягучы рахунак, памяшканне. Каб усё гэта ліквідаваць, неабходна стварыць камісію, закрыць рахункі, перадаць маёмасць... А каму? І дзе потым яе шукаць? Словам, зноў залішняя валакіта. Некаторыя кажуць: ды працуйце вы так! Як «так», калі гэта процізаконна?



**Супрацоўнікі ЖЭС № 5 дыспетчар Наталля АСТАПЧЫК, майстар Тамара КАСЕЦКАЯ і бухгалтар Таццяна РАГАЦЕНЬ сочаць за парадкам.**

Сёння «Надзея» знаходзіцца ў стане чакання. Ад імя камітэта ніхто ніякіх дзеянняў не распачынае ды, па праўдзе кажучы, і не хочуць распачынаць.

Мясцовыя ўлады горада Баранавічы звярнуліся з прапановай у Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу — унесці змяненні ў артыкул Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», які датычыцца дзейнасці органаў грамадскага тэрытарыяльнага самакіравання. Іх падтрымаў і Брэсцкі абласны Савет дэпутатаў.

— Усяго толькі і трэба, што замяніць слова «ліквідуецца» на «перавыбіраецца», — лічыць Анатоль Банкевіч.

...Некалі жыхары Паркавай не верылі, што ўсталяваныя імі ліхтары пратрымаюцца хоць месяц. Але за тры гады ніводны не быў разбіты... Альтанку паставілі, фігуркі з дрэва, лавачкі — яны і сёння на месцы, цэлыя, непашкоджаныя. У іншых мікрараёнах горада людзі таксама заварушыліся: і мы хочам КТГС! Іх ініцыятыву падтрымлівае гарадскі Савет дэпутатаў. Таму што ўлада, якой бы багатай ні была, не ў стане прыйсці ў кожны двор і навесці там парадак.

— Цяжка было раскачаць гэты «маятнік», але мы яго раскачалі, абудзілі ініцыятыву ў людзей, — гаворыць Анатоль Банкевіч. — Шкада будзе, калі яна зноў затармозіцца. Так што апошняе слова — за заканатворцамі.

**Наталля КАРПЕНКА.**
*г. Баранавічы.*

## СТАРШЫНЯ СЕЛЬВЫКАНКАМА АТРЫМАЎ ХАБАР

**З наяўным пры атрыманні хабару ў Аршанскім раёне супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй па Віцебскай вобласці і іх калегі са сталіцы ля будынка сельскага Савета затрымалі старшыню сельскага выканкама.**

Як паведамілі ў прэс-службе УУС Віцебскага аблвыканкама, гэты старшыня атрымаў ад мясцовага жыхара 250 амерыканскіх долараў і 250 тысяч беларускіх рублёў за выдачу даведак аб выробленай сельгаспрадукцыі.

Раённая пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## МЯСНЫЯ КАНСЕРВЫ... БЕЗ МЯСА

**Факты рэалізацыі фальсіфікаваных мясараслінных кансерваў вытворчасці ЗАТ «Аролпрадукт» (Расія) былі выўлены ў красавіку на сталічных прадпрыемствах гандлю санітарна-эпідэміялагічнай службай горада Мінска.**

Так, на этыкетках кансерваў паведамлялася, што пакупнікам прапануецца «Тушонка кавалкавая з ялавічынай» і «Тушонка кавалкавая са свінінай», але інфармацыя аб утрыманні ў кансервах натуральнага мяса ялавічыны і свініны не адпавядала рэчаіснасці. Пастаўшчыком дадзенай «мясной» прадукцыі на беларускі рынак аказалася ТАА «Еўрагандаль». Дарэчы, у снежні мінулага года «Еўрагандаль» ужо прадпрымаў спробу пастаўкі ў Беларусь недабраякаснай прадукцыі, а менавіта пельменяў «Рускія» вытворчасці ТАА «Фабрыка замарожаных паўфабрыкатаў» (РФ), якія не змяшчалі ў сваім складзе натуральнага мяса.

Санітарна-эпідэміялагічная служба забараніла далейшую рэалізацыю прадукцыі нізкай якасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ДАЎГІ НЯДБАЙНЫХ

**Як было адзначана на калегіі Генеральнай пракуратуры, на 1 красавіка гэтага года агульная сума запазычанасці перад дзяржавай бацькоў, якія ўхіляюцца ад утрымання сваіх дзяцей, склала 92 мільярды рублёў. Усяго ж у нашай краіне налічваецца амаль 29,5 тысячы такіх даўжнікоў. Супраць самых злосных «неплацельшчыкаў» узбуджаны 1044 крымінальныя справы.**

Удзельнікі калегіі таксама выказалі занепакоенасць ростам злачыннасці сярод непаўналетніх у 67 раёнах краіны. Хоць у цэлым па краіне назіраецца змяншэнне падлеткавай злачыннасці. Напрыклад, у 2006 годзе было зарэгістравана 8133 крымінальных парушэнняў закона непаўналетнімі, а летась — 6572. Тым не менш, спыняцца на дасягнутых поспехах пракуратура не збіраецца. Генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч даў даручэнне падначаленым наладзіць з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ўлады больш цеснае ўзаемадзеянне ў справе прафілактыкі падлеткавай злачыннасці. З гэтага часу пракуратура будзе рэгулярна, кожны месяц аналізаваць стан злачыннасці сярод непаўналетніх. А яшчэ пракуроры неўзабаве распачнуць праверку выканання Закона «Аб дзяржаўнай падтрымцы маладзёжных і дзіцячых грамадскіх аб'яднанняў».

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

# АГРАТУРЫЗМ З МІНІМАЛЬНАЙ РЫЗЫКАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

І ўсё ж ці не найбольш значным аргументам аказаўся сам дом. Двухпавярховы катэдж будавалі доўга, уласнымі рукамі, аднак намаганні не былі марнымі — атрымалася арыгінальнае спалучэнне вялікай сялянскай печкі з сучасным дызайнам пакояў. Да таго, тут ёсць добрая руская лазня, конь з вупражжу, свойская птушка, пасека, шыкоўны сад, дзе ў тым ліку «прапісаліся» не зусім традыцыйныя для Беларусі абрыкосы, персікі, вінаград і фундук.

Усё гэта можна назваць своеасаблівымі стартавымі ўмовамі. Праўда, пачынаць турыстычную справу выключна на «старых запасах» Хліманковы палічылі няправільным. Адсюль і адмысловая падрыхтоўка да прыёму гасцей — замена даху, пашырэнне кухні, будаўніцтва асобнага ўвахода ў пакой для турыстаў, новая агароджа, дарожкі, альтанкі. У больш аддаленых планах — таксама стварэнне невялікага музейчыка народнага побыту, балазе, ад дзядоў і бабуль захаваліся кросны, прас на камянях, цэбры. А мэта нумар адзін — абсталяванне пакою гігіены. З душам і пральнай машынай.

Прычым скідваць з рахункаў апошнюю акалічнасць ні ў якім разе нельга. Як заўважае Анатоль Хліманкоў, ёсць шмат



прыкладаў, калі спробы наладзіць «вясковы» адпачынак у суседняй Расіі сышлі на нішто толькі па адной прычыне — гаспадары сядзібаў не змаглі стварыць звыклы «гарадскі» камфорт. Як ні дзіўна, але сярод аграэкатурыстаў сапраўдных «экстрэмалаў» так і не знайшлося.

### Не адразу. І не шмат

Не выпадае сумнявацца, што падрыхтоўчы перыяд запатрабаваў грошай. І немаленькіх. Па самых сціплых падліках, толькі адна альтанка абыходзіцца ў тысячу, а пакой гігіены — у тры тысячы долараў. Да таго ж, нельга забывацца на «нематэрыяльныя выдаткі»: дамовіцца з транспартам ці «адшукаць» патрэбныя будматэрыялы часам бывае таксама няпроста. Між тым, ці прынясе новая справа аддачу?

— Напэўна, кожнаму, хто бярэцца за аграэкатурызм, трэба адразу дакладна разумець, што гэта — не крыніца для звышпрыбытку, — мяркуе Анатоль Хліманкоў. — Прынамсі, першым часам ёсць сэнс прасіць за пражыванне не больш, чым па некалькі долараў у суткі, а аплата за абед, лазню ці арганізацыю экскурсіі ў той жа Магілёў павінны быць блізкімі да сабекошту. Прычым у любым выпадку варта не выстаўляць цэны адразу, а дамаўляцца зыходзячы з індывідуальных пажаданняў. Бо адна справа — заказаць шыкоўную вячэру, і зусім іншая — абысціся звычайнай бульбачкай з салам.

Казаць аб якіх-небудзь «турыстычных» планах сядзібы ў Хонькавічах яшчэ рана. Гэтаксама як і весці гаворку аб «эканамічных выніках». Дакументы на рэгістрацыю тут падалі ў снежні мінулага года, таму сёлетні сезон будзе толькі першым. Пакуль жа, заўважае гаспадар, дакладна вядома адно — пры любой раскладцы сям'я нічога не страціць.

— Вельмі спадабалася, што рэгістрацыя сядзібы прайшла вельмі хутка, без залішняй бюракратыі, — адзначае Анатоль Хліманкоў. — Для таго, каб займацца аграэкатурызмам у сельскай мясцовасці, дастаткова напісаць заяву ў сельвыканкам, зарэгістравацца ў падатковай інспекцыі, заплаціць збор у памеры 1 базавай велічыні (ці крыху больш за 30 тысяч рублёў), да таго ж, нам не спатрэбілася збіраць ніякіх дадатковых дазволаў ні ад пажарных, ні ад санслужбы. А надалей неабходна будзе толькі падаваць справаздачы аб сваёй дзейнасці ў падатковыя органы. Пры гэтым да канца 2010 года даходы ад аграэкатурызму не абкладаюцца падаткамі і іншымі абавязковымі плацяжамі — словам, «цаной рызыкі» тут аказваецца тая ж базавая велічыня. Што ж да ўкладанняў у сядзібу, то сэнсу асабліва хваляваца тут няма. Паедуць да нас госці — мы будзем зарабляць. А калі раптам не паедуць — усё зробленае застанецца нам і нашым дзецям.

**Сяргей ГРЫБ.**
*Чавускі раён.*


**ЗАСНАВАЛЬНІКІ:**

**САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**

**ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,**

**УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»**

**ГРАМАДСКІ САВЕТ:**

**МАЛАФЕЕЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні;

**АНІКЕЕВА Л. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

**САСОНКА М. П.,** член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце;

**СЯЛІЦКІ В. С.,** старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

**СІВАКОЎ В. А.,** старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

**ЯРКОВІЧ В. І.,** старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

**АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.**

*Кантактны тэлефон 292 21 03.*

Жывая зямля

# ЧЭМПІЯНАТ ФОТАПАЛЯЎНІЧЫХ







Пачатак мая ўнёс у жыццё беларускай фатаграфіі свежы струмень — у Прыпяцкім нацыянальным парку ўпершыню прайшоў рэспубліканскі чэмпіянат сярод фотапаляўнічых. Першы вопыт працы фатографаў непасрэдна ва ўлонні прыроды, можна сказаць, у экстрэмальных умовах, быў вельмі карысным для кожнага ўдзельніка і для творчага саюза «Фотамастацтва», бо ўжо на сёлетнюю восень запланаваны наступны чэмпіянат. Тэмай спаборніцтваў, дакладней, аб'ектам фотаздымкаў сталі птушкі, а месцам правядзення быў абраны Тураўскі луг, які з'яўляецца Рэспубліканскім біялагічным заказнікам. Разнастайнасць птушак, якія гэтай парою абжываюць поймы Прыпяці, можа прывесці ў захапленне любога арнітолага ці фотапаляўнічага, тым больш у час шлюбных гульняў і гнездавання, што і дазволіла кожнаму ўдзельніку праявіць увесь свой творчы і вынаходлівы патэнцыял. «Адкрываючы і паказваючы таямнічы свет птушак, мы прапагандуем прыгажосць і багацце беларускай прыроды», — кажа адзін з арганізатараў спаборніцтва, вядомы фатограф, галоўны рэдактар часопіса «Фотамагія» Сяргей Плыткевіч.

У незвычайным чэмпіянаце ўдзельнічалі не толькі фатографы-профі і навукоўцы-арнітолагі. З Круглянскага раёна прыехаў галоўны спецыяліст паляўнічай гаспадаркі Андрэй Шымчук, для якога спалучэнне прафесійных абавязкаў з фатаграфіяй стала штодзённай формай жыцця. З Маладзечанскага лясгаса прыехаў паляўніцтвазнаўца і вопытны фотапаляўнічы Віктар Казлоўскі. А Віктар Ярашук працуе ў Негарэльскім вучэбна-доследным лясгасе і таксама сур'ёзна «пакутуе» ад фатаграфіі. Старэйшы сярод удзельнікаў першага чэмпіянату — 70-гадовы фотааматар, даўні сябра часопіса «Родная прырода» Вадзім Сугойдзь, які ўсё жыццё працаваў экспедытарам паштовых вагонаў, ездзіў па прасторах СССР, а вольны час прысвячаў зносінам з прыродай, адводзіў душу фотапаляваннем.

Спаборніцтвы доўжыліся толькі адны суткі. Выбраўшы найбольш птушыную пляцоўку і не нарабіўшы птаству шкоды, неабходна было выкарыстоўваць сродкі маскіроўкі — змайстраваць сховішча ці паставіць палатку-засідку. І, галоўнае, цярпліва і нерухома чакаць сваёй удачы. У гэты час на Тураўскім лузе «тусуюцца» кнігаўкі, кулік-сарока, вераценік, марадунка, шчогаль, турухтан, разнастайнасць чаек, не кажучы пра чапель, буслоў і лебядзінае сямейства. Мне ж літаральна пашанцавала «сфоткаць» стайку дзікіх гусей яшчэ на падыходзе, калі яна ўзлятала пасля начнога адпачынку на маленькім астраўку затопленай поймы — бачыць гэтую птушку так блізка раней не даводзілася. У поле зроку патрапіў нават арлан-белахвост. Але мала бачыць птушку і зрабіць яе якасны партрэт, неабходна «спыніць» цікавы момант жыцця крылатай істоты, паказаць рэдкі від, яго харраство, характар. А гэта ўжо сапраўднае мастацтва палявання і фатаграфіі. Таму сярод вялікай арміі фатографаў розных жанраў і спецыфік фотапаляванне займае асобнае месца, і спецыялістаў па гэтай частцы ў Беларусі не так ужо і шмат. Але менавіта на такі ўзровень разлічваюць арганізатары нованароджанага віду спаборніцтваў: Нацыянальны парк «Прыпяцкі», тэлерадыёкампанія «Мір», Беларускае грамадскае аб'яднанне «Фотамастацтва», Грамадскае аб'яднанне «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і Інтэрнэт-партал «ZНЯТА».

Лепшыя фота з чэмпіянату будуць выстаўлены не толькі ў Інтэрнэце на ўсенародныя агледзіны і абмеркаванне, але стануць ўпрыгажэннем новага часопіса «Дзікая прырода» — яго прэзентацыю з нецярпеннем чакаюць усе фотапаляўнічыя Беларусі.





**На здымках:** *«фота ўдзельнікаў на памяць» перад фотапаляваннем; чародка кулікоў шукае выспачку для кармлення; у час зацішша кнігаўка нібы цалуе сваё адлюстраванне; турухтан, заняты сваёй знешнасцю на ранішнім сонейку; самачка чорнай крачкі з задавальненнем прымае «падарункі» ад свайго ўхажора.*

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**




## АПЕРАЦЫЯ «...ЖЫЎЦОМ»

На маёй радзіме, на Гомельшчыне, схавалася ў лясах вёска з прыгожай назвай Дуброўка. Некалі яна была вялікай і шматлюднай. Прычым люд там, як паўсюль на Палессі, быў вельмі працавіты і лагодны... Крыўдзіўся (зведаў на сабе) толькі на адно, прычым даўняе.

Неяк у далёкія пасляваенныя часы галодны воўк высачыў вясковага сабаку. Той, ратуючыся, лёцьма ляцеў да вёскі і там ужо сігануў у хлеў. Воўк у азарце пагоні — даўся за ім. А непадалёк гаспадар таптаўся, убачыў і дзверы на кручок. Драпежнік, значыць, апынуўся ў пастцы.

Далей усё пайшло, як у вядомай байцы Крылова: на раду сышлося ці не ўсё сяло і, лічы, кожны да ваўка меў свае прэтэнзіі. Вінавацілі яго ва ўсім... Нават у недародзе! А таму прысуд быў строгі: «Браць жыўцом!»... Для правядзення аперацыі стварылі спецыяльны атрад. Узначаліў яго старшыня мясцовай гаспадаркі, які кожнаму і ўсім давёў баявую задачу.

Настаў і час выканання: ратнікі «ашчаціліліся» каламі і віламі, з вяроўкай напагатове замерла група захопу. Здалёк, з-за платоў сваімі абранцамі любаваліся жанчыны. На дрэвах, у чаканні відовішча, гронкамі вісела дзятва...

І вось прагучала адпаведная каманда — дзверы хлява адчыніліся. Воўк з нянавісцю паглядзеў на людзей, ашчэрыў клыкастую ляпу, зрабіў крок наперад і...

На адно імгненне, не больш, мужыкі... разгубіліся, спужаліся, і гэтага якраз зверу было дастаткова. Для таго, каб магутным кідком парваць ланцуг добраахвотнікаў і тут жа знікнуць.

Правал аперацыі «...жыўцом» вёска перажывала доўга. А мо, перажывае і дасюль, бо напамінаць пра яе дуброўцам — сабе даражэй...

Ну хіба здалёк?

**Леанід Якаўлевіч МІШУЦІН,** *г. Пінск.*

## НАШТО САБАКУ «ТРЭЦЯЯ НАГА»

Гады тры таму каля вёскі Камень, што ля Івянца, чакалі мы са сватам аўтобуса. Сядзім, значыць, гамонім, — бабуля далучаецца, сватава знаёмая: нагу побач выцягнула, кавеньку ля яе палажыла. Гаворыць, што хварэла шмат, што «без трэцяй нагі» цяпер нікуды ўжо...

Не ведаю, як у яе тыя дзве (спадніца доўгая), а гэта, «трэцяя», дык дужа страшная была — уся нейкая пагрызеная, падрэпаная, фарба аблезлая...

Жанчына ці не думкі мае прачытала? Кажа:

— Людцы, ды з гэтай кавенькай у мяне такая прыгода была... Зазімкам летась выйшла ў двор, бачу: нейкі сабака ля студні сядзіць. Ну, думаю, сцягнуць нешта хоча. Крычу на яго: «Во-он адсюль!», а той — каб з месца. Адно — прыўстаў крыху. І хвастом віхляе. «Ах ты,' думаю, гад! Яшчэ і дражніцца... І палкай у яго. З метр недакінула...

Дык ён, не паверыце, падбег, у зубы яе ўзяў і... ходу, у лес. Я, кульгаючы, за ім — можа ж, думаю, кіне. Дзе там! Што рабіць, — пагаравала, знайшла сабе другую падпорку, жыву.

Толькі неяк раз бачу — той самы сабака, на тым самым месцы. І, не паверыце, у зубах маю кавеньку трымае. Я да яго:

— От, — кажу, — маладзец! Харошы сабачка — падпорачку маю прынёс. То аддай, а я цябе каўбаскай пачастую.

Вярнулася ў хату, скрылёк адрэзала, вынесла. Кажу яму: «Давай мяняцца?»

Ён хвастом памахаў і, падобна, згадзіўся — схапіў гасцінец і зноўку ў лес. А кавенька во засталася і цяпер я яе нізавошта нідзе не кіну. А ў сабаку — тым больш.

**П.І.БРАТОК,** *г. Мінск.*

## ЧАГО ХОЧА ЖАНЧЫНА...

У нас на прадпрыемстве працуе многа сямейных. Так што гэту гісторыю я чула ад дваіх.

— Мяне сёння жонка паднялa, — расказваў муж. — Сказала: «Уставай! Ужо гімн быў. На работу пара». Я падняўся, памыўся, пагаліўся, пайшоў на аўтобус. На прыпынку, гляджу, ні душы. Значыць, думаю, нядаўна людзі паехалі, з-пад носа аўтобус сышоў, хвілін праз дзесяць яшчэ адзін будзе, паспею.. Дзіўна толькі, што народ не ідзе. І транспарту на вуліцы мала... Нават маршрутак няма... Глуха вакол і ціха-ціха. Адно, чую, жонка з балкона нешта крычыць (прыпынак побач з домам) і рукамі размахвае...

Далей расказвала жонка:

— Ён з хаты, а мне ж не спіцца. Устала, глянула на гадзіннік. Палова першай там... Ночы... Крычу яму: «Валодзя, ідзі дамоў! Я памылілася». А ён і вухам не вядзе: стаіць, аўтобуса чакае... Паўдома падняла, пакуль ён зразумеў... Прыйшоў, распрануўся, лёг.

— Во, — кажу кабеце, — які ён у цябе старанны: па два разы на дзень на работу ходзіць. А ты ж яго, мо, для іншай працы будзіла?..

— Ды халера вас, баб, разбярэ, — сумеўся мужчына і падаўся прэч. Пад наш дружны жаночы рогат.

**Святлана ЯРМАЛЮК,** *г. Брэст.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

**Чытайце ў наступным нумары**

**«Тэрапія" для "збочыўшых" бацькоў**

**«Дзеці вельмі добрыя, а сваіх бацькоў яны проста абагаўляюць. Была дзяўчынка, якая тут па тэлефоне выхоўвала сваю маці: "Мама, ты не пі, табе сёння патрэбна схадзіць на работу, зрабі рамонт..." Словы дачкі адскоквалі ад свядомасці матулі, бы ад сценкі гарох: клапатлівая дачушка стала сацыяльнай сіратой.»**

# ПАТРЭБНАЯ АСУДЖАНЫМ НАДЗЕЯ

**Да гэтай сустрэчы мне здавалася, што тыя, хто прайшоў праз турму — загінулыя людзі. Я не верыла, што турма выпраўляе. Што зладзеі і забойцы могуць быць былымі. Я не сумнявалася, што такіх людзей трэба ізаляваць ад грамадства, і мне страшна было сустрэцца з імі ў жыцці. Я не падазравала, што агароджа — рэч умоўная. Як воля і несвабода. Што па гэты бок турэмных кратаў могуць жыць, хадзіць, ездзіць са мной у адным тралейбусе, і нават вітацца — такія ж самыя людзі, якія знаходзяцца па той яе бок. Нічым не горшыя і не лепшыя. Што нават я сама мала чым адрозніваюся ад любога са злачынцаў. Справа не ў тым, што ён здзейсніў. Справа ў самім чалавеку. У яго думках, памкненнях, сіле характару, душэўных якасцях... Проста абставіны жыцця могуць скласціся так ці інакш. Усе гэтыя думкі ахапілі мяне, калі я паспрабавала больш даведацца пра работу царквы ў турме.**

*«...у цемніцы быў, і вы прыйшлі да Мяне.»*
Мф.25,36

Уяўляю, як недарэчна мы выглядалі збоку: дзве дзяўчыны ля сцен мужчынскай папраўчай калоніі...

— Добры вечар, пойдзем! — вітае нас чалавек у форме і прадстаўляецца: — Павел Анатольевіч Макоўскі, намеснік начальніка калоніі па папраўчым працэсе і рабоце з асабовым складам. Дакументы ёсць? Добра. Адключыце мабільныя тэлефоны і разам з дакументамі здайце.

Дзверы «загулі» і мы прайшлі на тэрыторыю папраўчай калоніі №1 у Мінску. Першае ўражанне — бязлюднасць... Па дарозе ў адміністрацыйны корпус Павел Анатольевіч тлумачыць, чым яна выклікана: асуджаныя не працуюць у нядзелю. Таму на прамзоне, па якой мы ішлі, людзей не было. Але хутка тут сапраўды не будзе ні асуджаных, ні дроту: да 2011 года калонію гэту плануецца расфарміраваць. Таму адпала патрэба пабудаваць тут праваслаўны храм, а збіраліся...

Раптоўна, я не заўважыла адкуль, з'явіліся людзі — шмат, але ўсе аднолькавыя ў сваіх шэрых ватоўках, са стомленымі напружанымі, таксама шэрымі тварамі. Лаўлю сябе на жаданні пазбегнуць прамога позірку. Адводжу вочы, імкнуся хутчэй прайсці міма. Сама здзіўляюся сваёй рэакцыі. Гэта нават не страх, хутчэй, псіхалагічная абарона ад тых, на месцы якіх не хочаш апынуцца, і каму няма што сказаць...

Павел Анатольевіч прапаноўвае асабіста пагаварыць з людзьмі, для якіх дарога ў храм пачалася пасля перасячэння імі мяжы, якая падзяліла жыццё на «да» і «пасля».

## Гісторыя першая

Першым у кабінет увайшоў Дзмітрый, староста праваслаўнай царквы. Худаваты, высокі і сімпатычны, ён здаецца чалавекам адкрытым, лёгка ўсміхаецца, стараецца глыбока адказаць на пытанні. Я ведала, што ён здзейсніў надзвычай цяжкое злачынства, але глядзела на яго і не магла ў тое паверыць. Некаторыя яго словы выклікалі ў мяне здзіўленне, а некаторыя — адгукаліся глухім болем.

— Мне 35 гадоў. Я шматдзетны бацька, багаты на нявестаў: тры дачкі... Пачаў хадзіць у царкву, калі сур'ёзна захварэў — праблемы з лёгкімі. Турма — гэта школа... Думаеце, тут няма нічога добрага?.. Ёсць! Тут можна атрымаць адукацыю, набыць новую прафесію, прачытаць шмат кніг і, нарэшце, знайсці веру — на гэта ёсць час. Але кожны сам робіць выбар: нехта назаўжды мяняе сябе, нехта яшчэ больш азлабляецца, нехта пагружаецца ў смутак, а некаторыя губляюць розум...

Для мяне асабіста царква дае магчымасць каяцца кожны дзень... Мой грэх вельмі вялікі, яго немагчыма забыць... Мне пашанцавала з сям'ёй. Жонка прыходзіць на спатканні і мы падтрымліваем адно аднаго. Я вельмі шмат малюся за яе, сваіх дзяўчатак... Турма пайшла мне на карысць... Я змяніўся ўнутрана.





Нарэшце мы ў кабінеце Паўла Анатольевіча. Ён расказвае, што ў калоніі працуюць тры рэлігійныя арганізацыі: праваслаўная, каталіцкая і пратэстанцкая. У кожнай абшчыны ёсць свае памяшканні, дзе праходзяць набажэнствы і сходы. Праваслаўныя ў невялікім пакойчыку абсталявалі дамавую царкву: з алтаром, іканастасам, царскай брамай, аналоем. Асвяцілі яе ў гонар вялікамучаніцы Анастасіі Узарашыцельніцы. Царква гэта прыпісана да прыхода іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць», што знаходзіцца ў Мінску на вуліцы Прытыцкага.

— Храм патрэбны асуджаным, — гаворыць Павел Анатольевіч. — У першую чаргу таму, што вера дапамагае выпраўленню. Вярнуць чалавеку маральныя прынцыпы вельмі важна, бо рана ці позна асуджаны зноў вернецца ў соцыум. Па-другое, у тых, хто ходзіць у рэлігійныя арганізацыі, як правіла, не ўзнікае праблем з дысцыплінай. Яны не хамяць і падпарадкоўваюцца парадку. У адрозненне ад тых, хто шалее ад гультайства.

Некаторыя думаюць, што наведванне храма ў турме дае пэўныя патуранні. Сапраўды, бацюшкі могуць скласці хадайніцтва, але робяць яны гэта вельмі рэдка і асцярожна... Часцей адмаўляюць. Што тычыцца турэмнага начальства, то яно да тых, хто ходзіць у царкву, ставіцца роўна. За тое з іншымі асуджанымі на гэтай глебе нярэдка ўзнікаюць праблемы. Каб быць прыхаджанінам у калоніі, трэба навучыцца цярпліва адносіцца да насмешак і здзекаў.

Дзмітрый асуджаны на 20 гадоў пазбаўлення волі. Восем з іх ужо адбыў у калоніі. Калі ён здзейсніў злачынства, яго малодшай дачцэ быў год.

## Гісторыя другая

Віталіўсу, старасце каталіцкай абшчыны, 36 гадоў. Ён падаецца мне не такім адкрытым, адказвае адназначнымі кароткімі фразамі. Ды і настрой у яго, відавочна, не надта быў схільны да размовы з журналістам. Таму гутарка наша атрымалася кароткай. Па сутнасці, ён выкладаў толькі факты. Гэты чалавек асуджаны за махлярства. Але ёсць у яго адны агульныя з Дзмітрыем абставіны: ён таксама шматдзетны бацька.

— У мяне дачка і два сыны. Але, на жаль, мне не ўдалося захаваць сям'ю... У касцёл я хадзіў і да таго, як апынуўся ў калоніі. Але цяпер разумею, што вера мая была тады не глыбокая. Цяпер усё па-іншаму. Да нас сюды прыходзіць ксёндз кожны чацвер а 19-й гадзіне. На яго пропаведзі збіраецца каля трыццаці чалавек. Калі нехта просіць, ён спавядае і прычашчае. Толькі тут я зразумеў, наколькі мне патрэбна вера. Сёння — гэта адзінае, што дае мне душэўны спакой і сілы жыць далей. У мяне быццам адкрыліся вочы, і я ўбачыў, якая пустэча была раней у маёй душы. Многія не здольныя мяне зразумець, але гэта не так важна.

## Гісторыя трэцяя

Наступны мой суразмоўца — Эрык, староста баптысцкай абшчыны. Ён цёмнаскуры і вялікі, нагадвае галоўнага героя «Зялёнай мілі». Як і Дзмітрый, адбывае пакаранне за забойства. З некаторай палёгкай даведваюся, што ён — не шматдзетны бацька, і нават увогуле пакуль дзяцей не мае. «Не спяшайся рабіць абагульненні», — кажу я сабе. А Эрык, між тым, не проста ўсміхаецца, ён расказвае мне свой аповед радасна. Бо гэта аповед пра яго прыход да Бога.

— Я прыехаў у Беларусь вучыцца. Сам я — грамадзянін Камеруна. Так атрымалася, што апынуўся тут... Яшчэ калі быў пад следствам, задумаўся пра Бога. Шмат разважаў і вырашыў вывучыць Біблію. У той жа дзень да мяне пасадзілі сакамерніка, які падарыў мне свой Новы Запавет. Праўда, на рускай мове. Я пачаў чытаць, але не вельмі шмат разумеў. У царкву не хадзіў, але праз некалькі гадоў мяне запрасілі на сход Хрысціян веры евангельскай. І я пайшоў. Там мне далі Біблію на англійскай мове — для мяне гэта вельмі зручна. Прыняў хрышчэнне 5 гадоў таму і цяпер вось вернік. Я зразумеў, што жыў не так, як гэтага жадае Бог, і цяпер цвёрда маю намер жыць па-іншаму. І ўжо жыву!

## Цана чалавечай слабасці

— У студзені 2008 года афіцыйна прыхаджанамі Свята-Анастасьеўскага дамавога храма лічыліся 79 чалавек, — знаёміць мяне з прыходскім жыццём у калоніі **свяшчэннік Аляксандр ПРОНІН**. — Але касцяк абшчыны складаюць 15—20 мужчын, якія рэгулярна прычашчаюцца і ўдзельнічаюць у набажэнст-вах. Для іх Хрыстос — не абстракцыя. Я ведаю людзей, якія змянілі сваё жыццё да лепшага менавіта пасля таго, як трапілі ў калонію. Вы кажаце: няўжо ім трэба было здзейсніць злачынства і трапіць у турму, каб прыйсці да веры і стаць лепшым? Гэта складанае пытанне, якое заслугоўвае асобнай размовы... Людзі ведаюць, што такое грэх, але дазваляюць сабе «маленькія грашкі», колькасць якіх расце, і паступова, незаўважна для сябе самога, чалавек становіцца рабом сваіх страсцяў. Несвабода фізічная стала натуральным вынікам несвабоды духоўнай. І цяпер яны маюць магчымасць знайсці свабоду духоўную ўнутры фізічных турэмных сцен. Злачынства — гэта не цана за прыход да Бога. Гэта цана ўпартасці ў граху. Але Гасподзь — бясконца міласэрны і дае магчымасць выправіцца кожнаму. І мяне вельмі натхняюць прыклады гэтага.

— Задача святароў — не асуджаць, а дапамагчы тым, хто прыходзіць у царкву такім цяжкім шляхам, — тлумачыць айцец Аляксандр. — Трэба мець мужнасць, каб пакаяцца ў смяротных грахах. Сёння і ў міру складана захаваць чалавечую годнасць: нормай лічацца многія цяжкія грахі, маральная планка ў грамадстве знізілася. Таму тым, хто ў калоніі, дзе злосць сканцэнтравана, цяжэй вярнуць сабе першасны вобраз — вобраз Божы. Зняволеным вельмі патрэбна надзея... Надзея на тое, што яны могуць стаць іншымі людзьмі. Бог сказаў: «Не хачу смерці грэшніка, але каб грэшнік адышоў ад шляху свайго і жывы быў».

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**



## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.08 | 21.05 | 15.57 |
| Віцебск — | 4.52 | 21.00 | 16.08 |
| Магілёў — | 4.58 | 20.55 | 15.57 |
| Гомель — | 5.02 | 20.44 | 15.42 |
| Гродна — | 5.25 | 21.19 | 15.54 |
| Брэст — | 5.32 | 21.12 | 15.40 |

**Месяц**
*Першая квадра. Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Імяніны**
*Пр. Ніны, Тамары, Ерамея, Ігната, Яфіма. К. Марыі, Юстыны, Баніфата, Віктара, Мацея, Міхала.*

## НАДВОР'Е на заўтра




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +22..+24°С | КІЕЎ +15..+17°С | РЫГА +3..+5°С |
| ВІЛЬНЮС +8..+10°С | МАСКВА +8..+10°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +5..+7°С |

## Дзве даты — 14 мая

**Сёння — Сусветны дзень барацьбы з гіпертаніяй. Адзначаецца штогод з 2005 года па ініцыятыве Сусветнай лігі барацьбы з гіпертаніяй.**

**1955 год** — падпісаны Варшаўскі дагавор аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе сацыялістычных краін. Дагавор падпісалі Албанія, Балгарыя, Венгрыя, ГДР, Польшча, Румынія, СССР, ЧССР. Мэтай Варшаўскага дагавора абвяшчалася забеспячэнне бяспекі краін — удзельнікаў дагавора і падтрыманне міру на кантыненце.



**1907 год** — нарадзіўся Іосіф Іосіфавіч Жыновіч, славуты беларускі цымбаліст, дырыжор, кампазітар і педагог. Народны артыст Беларусі (1955) і СССР (1968). З 1946 года мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1968).

## Цытата дня:

*«Найлепшы спосаб запомніць што-небудзь — пастарацца гэта забыць».*
**Мішэль Мантэнь (1533—1592), французскі пісьменнік.**




*Віншую з 18-годдзем* ***Алеся Аляксандравіча КАМАНДЗІРЧЫКА.***
*Желаю, чтоб люди ценили тебя,*
*Родные — тобою гордились,*
*И рядом пусть будут семья и друзья,*
*И годы чтоб счастливо длились.*
**Мама, г. Ашмяны.**

**РУП "БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ" ИЗВЕЩАЕТ**
**О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО "БРЕСТРЕСТАВРАЦИЯ"**

| Номер лота | ЛОТ № 1 | |
|---|---|---|
| Наименование объекта | **Административное здание (1928-1941 г.), общ. пл. 215 м² (инв. № 130/С-2439)** | |
| Местонахождение объекта | Брестская обл., г. Пинск, пл. Октября, д. 3 | |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Брестреставрация» | |
| Организатор торгов | РУП «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | |
| Начальная цена продажи, руб. без НДС | **165 197 700** | |
| Размер задатка, руб. | **8 259 885** | |
| Право на земельный участок | 0,0265 | после продажи объекта с аукционных торгов границы земельного участка будут уточняться путем выполнения комплекса топогеодезических работ |
| Тип и характеристика объекта | **Трехэтажное административное здание с пристройкой 1928—1941 года постройки.** Фундамент кирпичный ленточный; стены кирпичные оштукатурены; перекрытие деревянное; крыша шифер; полы дощатые, паркет. Проемы оконные двойные, дверные филенчатые. В здании имеются коммуникации: центральное отопление, водопровод, электроосвещение, канализация, телефон | |
| Условия продажи | аукцион без условий | |
| Условия оплаты | оплата производится в течение 6 месяцев с момента подписания протокола аукционных торгов | |
| Срок заключения договора купли-продажи | не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012221130016 рубли РБ в Московском отд. ОАО «Белинвестбанк» в г. Минске, код 741, УНН 190305149, расчетный счет 3012221135024 доллары США | |

**АУКЦИОН СОСТОИТСЯ 29 МАЯ 2008 г. в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329**
**Брестское областное управление**
**РУП «Белтехинвентаризация».**

*Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00*

**Последний день приема заявлений — 28 мая 2008 г. до 17.00.**

**Контактные тел.: 8 (0162) 23 94 25, 23 92 59, 21 88 81**

Документы, необходимые для участия в аукционных торгах, перечислены в объявлении, опубликованном в газете № 67 (26180) от 09.04.2008 г.

УНП 190305149

**УП «Минский городской центр недвижимости» (продавец) совместно с ИМНС по Советскому району г. Минска**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже подземного хранилища, пристроенного к подвалу ООО «Белкоминвест», расположенного по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 45, к. 1, общей площадью 107 кв.м. Начальная цена составляет 199 520 000 рублей. Отвод земельного участка будет произведен Минской городской землеустроительной и геодезической службой. Объект продается без условий. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости». Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. **Аукцион состоится 12 июня 2008 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.** Заявления и необходимые документы принимаются по 11 июня 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 6.

**Контактные телефоны: 227 40 22, 227 48 36.**

УНП 190398583